Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 ЛІПЕНЯ 2008 г. АЎТОРАК
№ 134 (26247)
Кошт 450 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Аляксандр Лукашэнка прыняў са справаздачай Пятра Пракаповіча

**Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб выкананні асноўных паказчыкаў грашова-крэдытнай палітыкі ў першым паўгоддзі.**

Нацыянальны банк за гэты перыяд праводзіў грашова-крэдытную палітыку, неабходную для выканання паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Выкананы ўсе паказчыкі, прадугледжаныя Асноўнымі накірункамі грашова-крэдытнай палітыкі. Так, крэдытаванне рэальнага сектара эканомікі ідзе апераджальнымі тэмпамі. На 1 ліпеня крэдытныя рэсурсы дасягнулі Br38 трлн і ў параўнанні з 1 ліпеня мінулага года павялічыліся больш чым у паўтара раза пры тым, што прагнознымі паказчыкамі было прадугледжана павелічэнне на 41 працэнт.

З апераджэннем ідзе інвестыцыйнае крэдытаванне. У прыватнасці, за паўгода выдана 75 працэнтаў інвестыцыйных крэдытаў ад гадавога задання. Льготнае крэдытаванне будаўніцтва жылля павялічылася на адну трэць у параўнанні з такім жа перыядам мінулага года. Крэдытаванне будаўніцтва жылля па звычайных працэнтных стаўках павялічана ў 1,6 раза. Значна ўзрасло спажывецкае крэдытаванне насельніцтва. У параўнанні з мінулым годам крэдыты на спажывецкія патрэбы павялічыліся ў 2,7 раза — больш чым на Br1 трлн 5 млрд.

Старшыня Праўлення Нацыянальнага банка расказаў, што працэнтная палітыка, якая праводзіцца, цалкам адпавядае Асноўным накірункам грашова-крэдытнай палітыкі: «Мы праводзім палітыку, якая садзейнічае прыцягненню ўкладаў насельніцтва, укладаў прадпрыемстваў, укладаў нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь, а з іншага боку вырашаем праблемы, каб у нашых прадпрыемстваў была магчымасць карыстацца крэдытнымі рэсурсамі». Гэта ўжо ў першым паўгоддзі ў цэлым выканана. Сродкі насельніцтва на банкаўскіх рахунках таксама растуць апераджальнымі тэмпамі, і за першае паўгоддзе прырост склаў каля Br2 трлн. Прырост сродкаў нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь дасягнуў Br1,8 трлн».

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## За тры гады плануецца прыватызаваць 519 прадпрыемстваў

**На працягу 2008—2010 гадоў у Беларусі плануецца прыватызаваць 519 прадпрыемстваў. План прыватызацыі зацверджаны пастановай Савета Міністраў № 1021.**

Так, у 2008 годзе запланавана прыватызацыя ВРУП «Мінскі маторны завод», КРУП «Оптаэлектронные сістэмы», ВРУП «Завод Мінскаграпраммаш», ВРУП «Мінскі механічны завод імя С.І. Вавілава», НВРУП «Белгазтэхніка», РДАРУП «Гомельтэкстыльгандаль». У 2009 годзе плануецца прыватызацыя такіх прадпрыемстваў, як Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання «Гомсельмаш», Беларускі аўтамабільны завод, Мінскі завод колавых цягачоў, РУВП «Віцязь», НВРУП «Агат-Сістэм», ПВРУП «Інкатэх», інстытут «Белдзяржпраект», завод «Электроніка», РУП «Гомельтранснафта «Дружба». Прыватызацыі ў 2010 годзе падлягаюць Мінскі завод аўтаматычных ліній імя П.М. Машэрава, Мінскі НДІ радыёматэрыялаў, Аршанскі льнокамбінат і іншыя.

**БЕЛТА.**

## Мінсельгасхарч ініцыюе павышэнне закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю на 10 працэнтаў

**Аб гэтым паведаміла начальнік галоўнага ўпраўлення эканомікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Ганна Андрыевіч.**

Цяпер галіновае міністэрства рыхтуе эканамічнае абгрунтаванне на павышэнне закупачных цэнаў на буйную рагатую жывёлу, свіней і малако і мае намер перадаць адпаведныя матэрыялы на разгляд ва Ўрад.

«Павышэнне закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю звязана з неабходнасцю пакрыцця затрат на яе вытворчасць і выраўноўваннем цэнаў на аналагічную прадукцыю з расійскімі рэгіёнамі», — падкрэсліла Ганна Андрыевіч, адзначыўшы пры гэтым, што міністэрства прапануе паэтапнае павышэнне цэн. У Беларусі ўжо адпрацаваны механізм эканамічнага стымулявання сельгасвытворцаў. Пры павышэнні закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю павінны адначасова на пэўны працэнт павялічвацца гранічныя адпускныя цэны. Зразумела, гэта магчыма пры павышэнні памеру заробатнай платы, пенсій і дапамог у цэлым па Беларусі. Такая работа ў гэтым напрамку цяпер праводзіцца. Ганна Андрыевіч адзначыла, што, напрыклад, павышэнне з 15 ліпеня гранічных адпускных цэнаў на ялавічыну на 2 працэнты з'яўляецца вынікам яшчэ вясенняга павышэння закупачных цэнаў на буйную рагатую жывёлу. Да гэтага часу перапрацоўчыкі нівеліравалі павышэнне закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю за кошт уласнага прыбытку. Аднак такая сітуацыя можа негатыўна адбіцца на іх эканоміцы. Павышэнне гранічных адпускных цэнаў дае магчымасць часткова кампенсаваць іх затраты.

**БЕЛТА.**

# ПЯЦЬ БУСЛОЎ НА ДАХУ





*Жыхары па вуліцы Ішчанка палескага горада Давыд-Гарадка сталі сведкамі рэдкай з'явы: на даху старой хаты пара буслоў высядзела і паставіла на крыло ажно пяць птушанят. «Тут ніколі не было болей за чатыры буські», — казалі суседзі, назіраючы маё карасканне па лесвіцы да птушынага гнязда. Што цікава: у Давыд-Гарадку на суседніх вуліцах ёсць яшчэ некалькі гнёздаў, але ў адным тры, а ў другім, наогул, толькі два бусляняткі. Бытуе меркаванне, што ў засушлівае лета белыя буслы адчуваюць, што не здольны пракарміць сваіх птушанят, і нярэдка выкідваюць іх з гнязда. Цяперашняе ж лета для кармёжкі было, бадай, самае спрыяльнае і тым больш на забалочаных берагах Гарыні.*

*Упершыню мне давялося бачыць гэты старажытны горад з вышыні птушынага палёту. Тым больш з такім неверагодна прыгожым першым планам. На шчасце, бусляняты яшчэ не лёталі і ім заставалася стаіцца і нерухома назіраць за маёй працай. А буслы-бацькі назіралі за «няштатнай» сітуацыяй з коміна суседняга дома даволі спакойна, нібы адчувалі, што небяспекі іхнім гадаванцам няма.*

*Дабрацца да птушынага гнязда мне дапамаглі байцы-пажарнікі трэцяй змены Давыд-Гарадоцкага аварыйна-выратавальнай часці МНС, якой кіруе капітан унутранай службы Яўген ГУДЗІМ. Дзень быў спакойны, экіпаж выратавальнай машыны, атрымаўшы заданне дапамагчы фотакарэспандэнту «Звязды», хутка прыбыў і ў лічаныя секунды стварыў выдатны пад'ём да самага буслінага гнязда. Дзве-тры хвіліны доўжыліся фотаздымкі, а потым пажарныя зноў неслі дзяжурства ў звычайным рэжыме. Вось яны, народныя памагатыя: начальнік каравула Рыгор МАТУСЕВІЧ, вадзіцель Леанід КАЛЬКО, камандзір аддзялення Уладзімір КУЗЬМІЧ і пажарны Анатоль МАЗАН.*

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

# НЯХІТРАЯ ЛОГІКА ВЫЛУЧЭННЯ

## Днямі кампанія па выбарах дэпутатаў перайшла ў актыўную фазу

**ВЫБАРЧЫ «РАСКЛАД»:**
***20 ліпеня — 18 жніўня: вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.***
***19 — 28 жніўня: рэгістрацыя кандыдатаў.***
***29 жніўня — 27 верасня: агітацыйная кампанія.***
***28 верасня — асноўны дзень выбараў, галасаванне.***

**Дадзены старт новаму этапу — вылучэнню кандыдатаў. А значыць, можна чакаць прыкметнага ажыўлення — як самой кампаніі, так і інтарэсу да яе. Сваімі меркаваннямі наконт перадвыбарнай дынамікі развіцця падзей у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» падзяліўся Мікалай ЛАЗАВІК — сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.**

— Бясспрэчна, пачалася актыўная стадыя выбарчай кампаніі — папярэднія этапы былі чыста арганізацыйнымі, — зазначыў ён. Цяпер прыйшла чарга праяўляць сваю актыўнасць не столькі арганізатарам, колькі непасрэдным удзельнікам выбараў — патэнцыйным прэтэндэнтам на дэпутацкае крэсла. Яны могуць вылучацца да 18 жніўня ўключна. Сама працэдура, нагадаем, магчыма трыма спосабамі: ад палітычных партый, працоўных калектываў і грамадзян шляхам збору подпісаў. Першы і самы просты, на думку нашага суразмоўцы, прадугледжвае наступную схему:

— Партыя праводзіць з'езд, падчас якога яна можа вылучыць кандыдатаў у дэпутаты па ўсіх выбарчых акругах, дзе ёсць яе структурныя фарміраванні. Гэта значыць, што калі ў акрузе ёсць нават першасная партыйная арганізацыя — тры чалавекі — партыя можа вылучыць там свайго кандыдата. І калі ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных пытанняў палітычныя партыі ў Беларусі адыгрываюць вельмі неістотную ролю, то ў выбарчым працэсе ім адводзіцца неймаверна большая роля. Яны могуць вылучаць кандыдатаў у дэпутаты, накіроўваць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі і сваіх назіральнікаў за выбарамі. Хоць многія палітыкі і гэта лічаць недастатковым... Што ж, відаць, палітыкі і павінны быць амбіцыйнымі, імкнуцца да дасягнення большых вынікаў.

Вельмі істотная ўмова — вылучаныя кандыдаты павінны быць членамі гэтай самай партыі. Іншая сітуацыя з працоўнымі калектывамі — зусім не абавязкова, каб іх вылучэнец (можа быць прапанаваны толькі адзін кандыдат і толькі ад той акругі, дзе знаходзіцца арганізацыя) працаваў менавіта на гэтым прадпрыемстве. Пры гэтым мінімальная колькасць працаўнікоў, дастатковая для вылучэння кандыдата, — 300 чалавек.

— Калі працаўнікоў менш, можна праводзіць сход двух калектываў, — удакладняе сакратар ЦВК. — Прычым ад кожнага павінна прысутнічаць не менш за палову супрацоўнікаў.

Самы ж складаны шлях да кандыдацтва, як выказаўся Мікалай Лазавік, — праз збор подпісаў:

— Грамадзянін, які вылучаецца шляхам збору подпісаў, павінен сфарміраваць ініцыятыўную групу — не менш за дзесяць чалавек. Для яе рэгістрацыі трэба падаць адпаведную заяву ў акруговую камісію да 24 ліпеня. На прыняцце рашэння камісіям даецца пяць дзён. Толькі з моманту рэгістрацыі ініцыятыўная група можа збіраць подпісы.

Задача першых прыхільнікаў патэнцыйнага дэпутата — удзельнікаў яго ініцыятыўнай групы — сабраць як мінімум тысячу подпісаў. Гэта неабходны ліміт для вылучэння кандыдата ў дэпутаты.

— Калі ў вылучэнца салідны выбарчы штаб — група можа быць і сто, і дзвесце чалавек, — то гэта задача нескладаная, — кажа сакратар Цэнтрвыбаркама. — Мяркую, кандыдаты будуць скарыстоўваць звыклую тактыку — вылучацца не адным спосабам, а сумяшчаць: скажам, ад працоўнага калектыву і шляхам збору подпісаў.

Дакументы аб зробленай працы суіскальнік дэпутацкага мандата падае ў акруговую выбарчую камісію. Калі грамадзянін, напрыклад, вылучаецца ад палітычнай партыі, то ён павінен прадаставіць і пратакол з'езда, і дакументы аб рэгістрацыі партыі, і дакументы, якія пацвярджаюць яго членства ў партыі, і заяву аб згодзе балатавацца, і дэкларацыю аб прыбытках і маёмасці, і біяграфічныя даныя. Толькі на падставе гэтых «рэчдоказаў» ён можа быць зарэгістраваны ў якасці кандыдата. Аднак патэнцыйныя кандыдаты звычайна не спяшаюцца з падачай дакументаў, больш за тое — адкладваюць гэта ледзь не на апошні дзень.

— Пэўная логіка тут ёсць, — пагаджаецца Мікалай Лазавік, — чым раней будуць здадзены дакументы, тым больш часу ў акруговай камісіі на іх праверку і тым больш дбайнай будзе сама праверка. А значыць, большая і верагоднасць выяўлення нейкіх памылак, недакладнасцяў. Таму, як правіла, дакументы здаюцца бліжэй да завяршэння працэсу вылучэння, і часам менавіта ў апошнія дні мы даведваемся аб тым, наколькі актыўна ідзе вылучэнне кандыдатаў. Яны захоўваюць інтрыгу. Такая тактыка выпрацавана палітычнымі партыямі ў ходзе папярэдніх палітычных кампаній.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## «Еўрабачанне-2009» прапішацца ўсё-такі ў Маскве

**Міжнародны тэлевізійны конкурс «Еўрабачанне» ў наступным годзе пройдзе ўсё ж у Маскве. Такое рашэнне ўчора агучыў прэм'ер-міністр РФ Уладзімір Пуцін.**

Расія атрымала права правесці конкурс пасля сёлетняй перамогі Дзімы Білана ў Бялградзе. Пры тым асноўнымі прэтэндэнтамі на прыём «Еўрабачання» былі Масква і Санкт-Пецярбург. Пасля доўгіх ваганняў расійскі ўрад вырашыў, што «ўзровень падрыхтоўкі аб'ектаў і развітасць інфарструктуры» вышэйшыя ўсё ж у Маскве. Акрамя таго, да ўвагі прымалася магчымасць зменшыць выдаткі на правядзенне конкурсу (дарагавізна жыцця ў Маскве стала адной з прычын негатыўнай рэакцыі многіх еўрапейскіх краін). Вырашана пытанне і з галоўнай сцэнічнай пляцоўкай — ёй стане спарткомплекс «Алімпійскі», які здольны прыняць да 25 тысяч гледачоў адначасова. Як чакаецца, у «Еўрабачанні-2009» возьмуць удзел 43 краіны, а колькасць тэлегледачоў перавысіць 100 мільёнаў чалавек.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

ISSN 1990 - 763X
08134>
9771990763008

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ГЕРМАНІЯ ВЫПЛАЦІЦЬ КАМПЕНСАЦЫІ ЯЎРЭЯМ, ЯКІЯ ВЫЖЫЛІ Ў БЛАКАДНЫМ ЛЕНІНГРАДЗЕ

**Урад Германіі і Камісія па прад'яўленні яўрэйскіх матэрыяльных іскаў да Германіі дасягнулі пагаднення, згодна з якім яўрэі, якія перажылі блакаду Ленінграда, будуць прыроўненыя да ахвяраў Халакоста, і атрымаюць аднаразовую выплату ў памеры 2556 еўра, паведамляе NEWSru Israel.**

Права на кампенсацыю атрымаюць яўрэі, якія пражываюць у Ізраілі і краінах Захаду, што знаходзіліся ў Ленінградзе ў перыяд з 8 верасня 1941 года па 27 студзеня 1944 года або былі эвакуяваны з горада пасля пачатку блакады.

Згода ўрада Германіі выплаціць кампенсацыі стала першым прызнаннем праследавання нацыстамі 300 тысяч яўрэяў Ленінграда і прыгарадаў. Найболей вядомым з'яўляецца масавае забойства 800 яўрэяў, жыхароў Пушкіна.

### РАСІЙСКІЯ БАМБАРДЗІРОЎШЧЫКІ МОГУЦЬ ВЯРНУЦЦА НА КУБУ

**Расійскія бамбардзіроўшчыкі Ту-160 і Ту-95МС могуць вярнуцца на Кубу як адказ на разгортванне амерыканцамі сістэмы ПРА ў Польшчы і Чэхіі.**

Расійскія самалёты далёкай стратэгічнай авіяцыі Ту-160 (лётчыкі завуць яго «Белы лебедзь») і Ту-95МС (натаўцы празвалі яго «Мядзведзь») не толькі тэхнічна здольныя даляцець да Кубы, але і нібы ўжо садзяцца на Востраве волі. Аб гэтым заявіла газеце «Известия» нейкая высокапастаўленая крыніца. Але, паводле яе слоў, пакуль няма «палітычнага» рашэння. Атрымаўшы гэтую сенсацыйную навіну, выданне папрасіла спецыялістаў і чыноўнікаў пракаментаваць словы ананімнай высокапастаўленай крыніцы. Высокапастаўлены суразмоўца ў штабе Стратэгічнай далёкай авіяцыі заявіў газеце, што «гэта толькі размовы». «Пры гэтым не буду казаць, што за імі нічога рэальнага не стаіць», — заўважыў ён. Адзін з экспертаў газеты адзначыў, што ў ЗША на Кубе ёсць свае «вочы і вушы» — база Гуантанама. Таму, калі б самалёты расійскай стратэгічнай авіяцыі сапраўды садзіліся на Кубе, даўно б здарыўся скандал.

### БАСКСКАЯ ГРУПОЎКА ЭТА АДКРЫЛА «ЛЕТНЮЮ КАМПАНІЮ» СЕРЫЯЙ ВЫБУХАЎ НА КУРОРТАХ

**Баскскія сепаратысты з групоўкі ЭТА ўзялі на сябе адказнасць за серыю выбухаў, што прагрымелі на выхадных на курортах поўначы Іспаніі.**

Гэтымі тэрактамі арганізацыя адкрыла так званую «летнюю кампанію». Пакуль абышлося без ахвяраў: як паведамляюць СМІ, былі выкарыстаныя выбуховыя зарады малой магутнасці, а таксама незадоўга да тэрактаў у паліцыю паступіў ананімны званок з папярэджаннем. Нападу тэрарыстаў падвергнулася правінцыя Кантабрыя. Урон ад выбухаў быў нязначны: разбілася толькі некалькі вокнаў.

### БАМБАРДЗІРОЎШЧЫК ВПС ЗША ЗВАЛІЎСЯ Ў ЦІХІ АКІЯН. ЁН МОГ НЕСЦІ ЯДЗЕРНУЮ ЗБРОЮ

**Стратэгічны бамбардзіроўшчык B-52 ВПС ЗША разбіўся каля Гуама — вострава ў заходняй частцы Ціхага акіяна.**



Двое з шасці членаў экіпажа выратаваныя. Такі самалёт можа несці ядзерную зброю, аднак аб яе наяўнасці або адсутнасці амерыканскае камандаванне ніколі не інфармуе.

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народную артыстку Расіі Ларысу Трухіну з юбілеем

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 20 ліпеня павіншаваў народную артыстку Расіі Ларысу Трухіну з юбілеем.**

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў артыстцы за падтрыманне духоўнай сувязі з беларускай зямлёй, цёплае і сардэчнае выкананне беларускіх песень, актыўны ўдзел у сумесных канцэртах і культурных акцыях. «Вас па праву можна назваць паслом беларускай культуры на расійскай сцэне», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Ларысе Трухінай здароўя, творчых дасягненняў, удзячных слухачоў, шчасця і дабра.

## Беларусь і Бельгія могуць развіваць супрацоўніцтва ў інтарэсах умацавання бяспекі ў Еўропе

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Караля бельгійцаў Альберта II з Нацыянальным святам Каралеўства Бельгія.**

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць у тым, што ўсебаковыя беларуска-бельгійскія адносіны будуць плённа развівацца на карысць дзвюх краін, а таксама ў інтарэсах умацавання міру і бяспекі ў Еўропе.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ДВУХНОГАЯ КАЛМАТАЯ ІСТОТА З'ЯВІЛАСЯ Ў ЛІДСКІМ РАЁНЕ

**У Лідскім раёне з'явілася дзіўная двухногая істота. Яна прыкладна паўтараметровага росту, пакрытая чорнай поўсцю і падобная на малпу, паведамілі ў прэс-цэнтры Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС.**

Дзесяткі людзей бачылі гэту істоту — на кукурузным полі каля вёскі Красноўцы, каля магазіна і ў раёне вёсак Кавалі і Рулевічы. Адзін з хутаранаў бачыў яе на ўласнай яблыні, калі яна ласавалася няспелымі пладамі. Разгледзець і падрабязна апісаць «кінг-конга» нікому не ўдалося, паколькі пры выяўленні ён адразу ж знікае.

Як мяркуюць спецыялісты абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, гэта малпа, якая аднекуль уцякла. Але ў Гродзенскім заапарку паведамілі: іх прыматы ўсе на месцы.

**Рычард САЛАТА, БЕЛТА.**

### ХУТКА ПРЫПЯЧЭ ПА-ЛЕТНЯМУ

**Пачынаючы з другой паловы тыдня ў Беларусі чакаецца істотнае пацяпленне, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.**

Такім чынам, у сярэдзіне тыдня паветраныя масы зменяцца на ўсходнія і да нас завітае цёплае паветра з цэнтральных раёнаў Расіі. У сераду ўдзень тэмпература паветра павялічыцца да 20—26 градусаў, а па Гомельскай, паўднёвым усходзе Магілёўскай абласцей — да 30 цяпла. У чацвер—пятніцу спякотнае надвор'е распаўсюдзіцца ўжо на ўсю тэрыторыю Беларусі. У гэтыя дні кароткачасовыя дажджы чакаюцца толькі ў паўднёвай частцы нашай краіны. Таму 24—25 ліпеня тэмпература паветра ўначы будзе 12—19 градусаў, удзень 25—30, а па паўднёвым усходзе — да 32 градксаў цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, у выхадныя захаваецца летняе цёплае надвор'е. У суботу часткова па поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцях, а ў нядзелю месцамі па Беларусі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ў начы 13—19, удзень у суботу 25—30, у нядзелю 23—28 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### «ГОНКІ» ПА ПРАСЁЛКУ

**Убачыўшы патрульную машыну супрацоўнікаў АДАІ Пухавіцкага РАУС, вадзіцель аўтамабіля ВАЗ-2106, які ехаў каля дзевяці гадзін вечара па дарозе Голацк—Зазерра, рэзка затармазіў, даў задні ход і звярнуў паблізу вёскі Яснае на палявую дарогу.**

Тое, як кіроўца адрэагаваў на з'яўленне патруля, прымусіла праваахоўнікаў пачаць праследаванне ўцекача: уключыўшы праблісковыя маякі і гукавы сігнал, яны спрабавалі спыніць машыну, аднак дарэмна — невядомы на вялікай хуткасці нёсся па вёсцы. Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, пасля таго, як вёска засталася ззаду, вадзіцеля зноў паспрабавалі прывесці да розуму: яго неаднаразова папярэджвалі аб неабходнасці спыніцца, але і гэтыя спробы не далі выніку. Давялося праваахоўнікам прымяніць зброю: пасля таго, як парушальнік не адрэагаваў на два папераджальныя стрэлы ўверх, інспектар ДПС ДАІ зрабіў чатыры прыцэльныя па колах аўтамабіля з табельнай зброі. У выніку задняе правае кола аўтамабіля ўцекача было пашкоджанае, але ён праехаў на спушчанай шыне яшчэ два кіламетры. Як высветлілася, за рулём аўто знаходзіўся 19-гадовы юнак, які не меў вадзіцельскага пасведчання і кіраваў машынай бацькі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ТРАТУАРЫ Ў ГРОДНЕ МЫЮЦЬ ШАМПУНЕМ

**У Гродне тратуары цэнтральных вуліц Савецкай і Ажэшкі, а таксама плошчу Савецкую, дарожкі парку Жылібера пачалі мыць з выкарыстаннем вадкага мыла і шампуню. Такое рашэнне прыняла адміністрацыя мясцовай жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Аб гэтым паведамілі ў прэс-цэнтры Гродзенскага гарвыканкама.**

Паводле слоў суразмоўцаў, новаўвядзенне вельмі да месца, бо пасля кожнай ночы, асабліва святочнай, на брусчатцы, дарожных цэментных і мармуровых плітках застаюцца плямы ад піва і іншы бруд, які трэба старанна змываць. Штодзень, калі няма дажджу, на ўборку цэнтра горада выходзіць 10 брыгад дворнікаў. У Гродне тратуары падмятаюць шчоткамі і мыюць шампунем і ў іншых месцах, напрыклад, каля офісаў, магазінаў, «буцікоў» і на рынках. Такім чынам прыбіраюць і дваровыя пляцоўкі, дзе гуляюць дзеці, адзначылі ў гарвыканкаме.

**Рычард САЛАТА, БЕЛТА.**

### СУСЕДЗІ ДАПАМАГЛІ

Сярод белага дня каля в. Хобовічы Кобрынскага раёна нехта ўкраў каня. Следства неўзабаве ўстанавіла, што гэта зрабіў беспрацоўны жыхар в. Руховічы, які пабываў ужо на зоне за рабаванне. Канакрада затрымалі ва Украіне валынскія міліцыянеры.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
по поручению комиссии по работе
с имуществом, обращенным в доход государства,
при Слуцком райисполкоме

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимости, расположенных по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 292, в том числе: ЛОТ № 1 – административно-хозяйственное здание (общ. пл. 743,1 кв.м). Начальная цена 297 000 000 бел. руб и ЛОТ № 2 – заправочная (общ. пл. 79,1 кв.м). Начальная цена 48 000 000 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 26.08.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25.08.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

УСП «УКС» ОАО «Электромодуль» совместно
с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже следующего имущества: **ЛОТ № 1** — торцовочный станок ЦМЭ-ЗА 1975 г.в. Нач. цена — 2 356 378 бел. руб. с НДС; **ЛОТ № 2** — строгальный станок 4-сторонний С-26-2 1987 г.в. Нач. цена — 9 602 695 бел. руб. с НДС; **ЛОТ № 3** — односторонний шипорезный ящичный станок ШПА-40 1960 г.в. Нач. цена — 6 687 591 бел. руб. с НДС; **ЛОТ № 4** — пресс гидравлический ДБ-2432 1977 г.в. Нач. цена — 6 310 343 бел. руб. с НДС. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с, указанный в Условиях проведения аукциона. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней с даты проведения аукциона. Оплата за объект осуществляется в течение 7 рабочих дней после окончания торгов. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 26 .08.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25.08.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства цеха газорезки (общ. пл. 364 кв.м), расположенного по адресу: г. Молодечно, ул. Замковая, 19. Начальная цена – 125 973 000 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены, перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **26.08.2008 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.08.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ОАО «Электромодуль» совместно
с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже грузового седельного тягача КАМАЗ-54112, 1997 г.в.; заводской номер 2097811. Нач. цена — 20 290 000 бел. руб. с НДС. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 26.08.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25.08.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.07.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 117,00 |
| 1 еўра | 3 360,10 |
| 1 латвійскі лат | 4 780,40 |
| 1 літоўскі літ | 973,27 |
| 1 чэшская крона | 146,16 |
| 1 польскі злоты | 1045,15 |
| 1 расійскі рубель | 91,20 |
| 1 украінская грыўня | 458,23 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 23,2120 |
| 10 UAH | 50,2424 |
| 1000 BYR | 10,9594 |
| EUR | 36,8142 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 21.07.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## Аляксандр Лукашэнка прыняў са справаздачай Пятра Пракаповіча

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пётр Пракаповіч падкрэсліў, што адначасова вырашаюцца пытанні даступнасці крэдытных рэсурсаў для насельніцтва і прадпрыемстваў. Сярэдняя працэнтная стаўка па крэдытных рэсурсах у беларускіх рублях склала 13,3 працэнта, у замежнай валюце — у сярэднім 10,8 працэнта, што на 0,2 працэнтнага пункта менш, чым у снежні мінулага года. Гэта добры вынік работы банкаўскай сістэмы Беларусі з улікам таго, што ў цэлым рэсурсы ў замежнай валюце на міжнародных рынках падаражэлі.

Плацежная сістэма на працягу паўгоддзя працавала рытмічна, устойліва. Вырашэнне гэтых задач праходзіла на фоне стабільнага курсу нацыянальнай валюты, які з пачатку года ўмацаваўся да долара ЗША больш чым на 1,5 працэнта і цяпер складае Br2117.

Пётр Пракаповіч адзначыў, што зніжэнне курсу еўра ў адносінах да расійскага рубля з'явілася стымулюючым фактарам для росту экспарту беларускай прадукцыі ў дзяржавы, якія з'яўляюцца нашымі асноўнымі гандлёвымі партнёрамі, — гэта Расія і краіны ЕС. Такім чынам, курсавая палітыка, якая забяспечыла стабільнасць нацыянальнай валюты і стабільнасць на фінансавым рынку, таксама цалкам адпавядае задачам, што паставіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў забяспечыць у другім паўгоддзі выкананне ўсіх прагнозных паказчыкаў і, у прыватнасці, вырашыць пытанні па забеспячэнні стабільнасці нацыянальнай валюты, а таксама паскорыць вырашэнне пытанняў па апераджальным крэдытаванні рэальнага сектара эканомікі. Патрэбнасці рэальнага сектара эканомікі па ўсіх накірунках павінны быць цалкам задаволены.

Пётр Пракаповіч пацвердзіў, што будуць забяспечаны не толькі бягучыя патрэбнасці эканомікі, але таксама зроблены захады па нарошчванні рэсурснай базы банкаў. У прыватнасці, рэсурсная база за першае паўгоддзе павялічана больш чым у паўтара раза і такімі ж тэмпамі будзе нарошчвацца ў другім паўгоддзі. Гэта з'яўляецца гарантыяй таго, што і ў наступныя гады банкі змогуць забяспечыць патрэбнасці ўсёй эканомікі ў рэсурсах і паслугах.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# НЯХІТРАЯ ЛОГІКА ВЫЛУЧЭННЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ну, а дакладна акрэсліцца кола кандыдатаў толькі пасля рэгістрацыі, якая пройдзе да 28 жніўня.

— Затым пачнецца яшчэ больш актыўны і цікавы этап — агітацыйная кампанія, падчас якой кожны кандыдат будзе асабіста сустракацца з выбаршчыкамі, прадстаўляць сваю праграму, знаёміць са сваімі палітычнымі мэтамі і поглядамі, выступаць у СМІ. Агітацыя скончыцца ў дзень перад выбарамі — 27 верасня. Непасрэдна ў дзень галасавання яна не дазволеная, — падкрэсліў сакратар Цэнтральнай камісіі.

Да 29 жніўня, як выказаўся Мікалай Лазавік, будуць прысутнічаць толькі элементы агітацыі — маўляў, агітацыя за тое, каб грамадзяніна вылучылі кандыдатам у дэпутаты.

— Практычна немагчыма вылучыць кандыдата, не расказваючы пра яго, — патлумачыў сваю пазіцыю сакратар ЦВК. — У цэлым агітацыя ў ходзе вылучэння не можа быць забаронена. Адзінае, што забараняецца, дык гэта раздаваць якія-небудзь друкаваныя матэрыялы — лістоўкі, плакаты, і тым больш якія-небудзь матэрыяльныя каштоўнасці, якія часам выкарыстоўваюць некаторыя кандыдаты, каб неяк задобрыць грамадзян — нейкія там каляндарыкі ды ручкі. Паўнакроўная агітацыя пачынаецца толькі тады, калі ёсць зарэгістраваны кандыдат у дэпутаты. Ён карыстаецца ўсімі тымі правамі, якія прадугледжвае Выбарчы кодэкс — сустракацца з выбаршчыкамі, мець давераных асобаў, выступаць у СМІ, атрымаць водпуск на гэты час — чарговы ці за свой кошт.

Пазмагацца за дэпутацкі мандат можа любы дзеяздольны грамадзянін Беларусі, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі, яму пры гэтым споўніўся 21 год і ў яго няма судзімасцяў.

— Гэта не азначае, што ў біяграфіі грамадзяніна наогул не можа быць судзімасцяў, — удакладняе Мікалай Лазавік. — Ёсць такое юрыдычнае паняцце, як пагашаная або знятая судзімасць. У такім выпадку грамадзянін можа браць удзел у выбарчай кампаніі ў якасці кандыдата ў дэпутаты.

Сярод абмежаванняў ёсць і пералік пасад, несумяшчальных са статусам дэпутата, — у прыватнасці, суддзі, дэпутаты мясцовых Саветаў. Такія кандыдаты стануць дэпутатамі толькі пры ўмове згоды на вызваленне ад пасады ў выпадку абрання.

Сакратар Цэнтрвыбаркама падкрэсліў, што сур'ёзных парушэнняў у гэтай выбарчай кампаніі пакуль выяўлена не было. Аднак выказаў пры гэтым здагадку, што дагэтуль проста не было сур'ёзных сутыкненняў інтарэсаў:

— Увогуле парламенцкая выбарчая кампанія характарызуецца тым, што, як правіла, такіх сутыкненняў вельмі шмат. І гэта вытлумачальна, бо шмат суб'ектаў: 110 выбарчых акруг, і ад кожнай павінен быць абраны толькі адзін дэпутат, а ахвотнікаў — у тры-сем разоў больш. Калі розныя суб'екты прэтэндуюць на адзін і той жа рэсурс, у тым ліку электаральны, тады яны прыкмячаюць адзін за адным недахопы, недагляды, памылкі ці свядомыя парушэнні і інфармуюць выбарчыя камісіі. Аднак пакуль вырашаліся чыста арганізацыйныя пытанні, такіх сутыкненняў не было.

За парушэнні «правілаў гульні», у залежнасці ад ступені «цяжару» прадугледжана самая розная адказнасць — ад папярэджання да зняцця з рэгістрацыі. Наколькі напружанай будзе гэтая выбарчая кампанія? Пажывём — убачым.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## Рэзкага павышэння цэнаў на муку і хлебабулачныя вырабы ў Беларусі не чакаецца

***Аб гэтым паведаміла намеснік дырэктара Дэпартамента па хлебапрадуктах Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Алена Пракопчык.***

**Паводле яе слоў, на фоне суседніх краін, дзе цэны на хлеб растуць значна, сітуацыя на хлебным рынку ў Беларусі больш кіруемая: цэны на хлеб як на сацыяльна значную прадукцыю павялічваюцца паэтапна — на дазволены Міністэрствам эканомікі працэнт росту або ў межах узроўню інфляцыі.**

Так, напрыклад, згодна з пастановай Міністэрства эканомікі ад 9 ліпеня гэтага года цэны на хлеб і хлебабулачныя вырабы з 15 ліпеня павялічаны на 3 працэнты, што дасць магчымасць часткова кампенсаваць рост затрат на вытворчасць прадукцыі.

У той жа час ва Ўкраіне, напрыклад, паводле паведамленняў СМІ, прагназуецца павелічэнне цэнаў на хлеб ледзь не ў паўтара—два разы. Магчыма, гэта звязана з недаборам збожжа ў мінулым годзе, выказала думку Алена Пракопчык. Акрамя таго, большасць хлебапякарняў ва Ўкраіне і Расіі прыватныя, і яны маюць права самастойна ўстанаўліваць цэны.

У Беларусі ў мэтах харчовай бяспекі ажыццяўляюцца дзяржаўныя закупкі збожжа — каля 1 млн тон. Дзяржзаказ паспяхова выконваецца на працягу шэрагу гадоў, таму праблем з забеспячэннем сыравінай для вытворчасці мукі ў рэспубліцы няма. Для забеспячэння сваёй вытворчай праграмы арганізацыі хлебапрадуктаў краіны закупляюць збожжа ў асноўным унутры рэспублікі. Для паляпшэння хлебапякарных якасцяў мукі невялікія аб'ёмы збожжа імпартуюцца. У прыватнасці, у гэтым годзе былі закуплены 84 тыс. тон.

Прадпрыемствы галіны забяспечаны харчовым збожжам аж да ўраджаю 2008 года.

**БЕЛТА.**

### Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «ПЕРАХОД НА 11-ГАДОВАЕ НАВУЧАННЕ Ў ШКОЛЕ ПРОЙДЗЕ ЛЁГКА»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 18 ліпеня прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця Магілёўскай гарадской ратушы.**

Аднаўленае збудаванне ўнікальнае па сваім архітэктурным і інжынерным вырашэнні. Будынак уяўляе сабой трохпавярховую пабудову, да якой прымыкае шмат'ярусная вежа. Унутраная аддзелка памяшканняў максімальна набліжана да XVII—XVIII стагоддзяў. Унікальны і вежавы гадзіннік, які ўпрыгожвае Магілёўскую ратушу. Сярод шматлікіх гадзіннікавых дыскаў ёсць асаблівы каляндар, стрэлка-паказальнік на механізме якога робіць поўны абарот за 500 гадоў. Па ходу свайго руху яна паказвае на круглыя даты самых значных у гісторыі Магілёва падзей, выгравіраваных на дыску.

Кіраўнік дзяржавы агледзеў у ратушы экспазіцыйныя памяшканні музея, прысвечанага гісторыі Магілёва.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, аднаўленая ратуша стане дастойным упрыгажэннем Магілёва. Знамянальна, што будынак быў адноўлены ў сваім ранейшым, гістарычным абліччы менш як за год.

Пасля кароткай экскурсіі па ратушы Прэзідэнт зрабіў пешую прагулку па вуліцы Ленінскай у Магілёве, якая нядаўна стала пешаходнай. Ён азнаёміўся з помнікамі архітэктуры XVIII—XIX стагоддзяў, вартымі ўвагі аб'ектамі добраўпарадкавання вуліцы, пагутарыў з гараджанамі, якія адпачываюць у гэтай частцы абласнога цэнтра. Як адзначаюць спецыялісты, за апошняе дзесяцігоддзе ў гістарычнай частцы горада праведзены рэстаўрацыйныя работы, якія па сваіх маштабах перасягаюць усё, што рабілася да гэтага.

Кіраўнік дзяржавы таксама цёпла пагутарыў з жыхарамі горада. Адказваючы на пытанні магіляўчан, Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў: у Беларусі заўсёды будуць паважліва ставіцца да ўсяго, што звязана з Вялікай Айчыннай вайной і памяццю пра абаронцаў Айчыны. Дзяржава выдзяляе значныя сродкі на падтрыманне шматлікіх памятных збудаванняў. Як чакаецца, у бліжэйшым будучым у Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з'явіцца новы прасторны будынак на праспекце Пераможцаў.

У час размовы мясцовыя жыхары закранулі тэму пераходу на 11-гадовую сярэднюю школьную адукацыю ў рэспубліцы. Прэзідэнт нагадаў, што пайшоў на змяненне сярэдняй школы пасля скаргаў бацькоў, незадаволеных адукацыйнай сістэмай, якая існавала да гэтага. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што 12-гадовае школьнае навучанне штогод патрабавала б дадатковых Br150 млрд.

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што ніякіх праблем у сувязі з новаўвядзеннямі не будзе. У прыватнасці, новыя падручнікі для 11-гадовай школы будуць гатовыя ўжо праз год. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што абноўленая школа не павінна страціць напрацаванае за папярэднія гады, у тым ліку і ў савецкі час. «Скончыўшы тую школу, мы і ў космас прарваліся, і ядзерную зброю стварылі. Але мы не вярнуліся ў ранейшую школу, а ўзялі адтуль лепшае», — сказаў Прэзідэнт.

Для настаўнікаў на гэты год будуць створаны адзіныя праграмы, якія потым пры неабходнасці будуць удасканальвацца.

Разам з тым, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, па-ранейшаму актуальнымі застаюцца праблемы тэсціравання, уступных экзаменаў у ВНУ, якія дзяржава будзе трымаць у полі зроку.

Было закранута і такое актуальнае пытанне, як істотны рост цэнаў на прадукты харчавання ў свеце. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што немагчыма штучна стрымліваць цэны на сельгаспрадукцыю ўнутры нашай краіны: у гэтым выпадку прадуктовыя тавары проста будуць вывезены ў суседнія дзяржавы. «Гэту сітуацыю мы можам пераадолець толькі эканамічнымі метадамі, у прыватнасці павелічэннем заработнай платы», — сказаў ён.

Прэзідэнт лічыць немэтазгодным штучна замарожваць цэны на прадукты харчавання і на тэрыторыі СНД. Паводле яго слоў, на нядаўняй сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў СНД з боку асобных краін ва ўмовах значнага падаражэння ў свеце сельгаспрадукцыі было выказана пажаданне ў Садружнасці «ўстанавіць стабільныя цэны на прадукты харчавання, замарозіць якую-небудзь пэўную цану на хлеб, малако, мяса».

«На гэта я сказаў: якія стабільныя цэны? Калі ў Расіі пачалі даражэць энерганосьбіты, мы прапанавалі ўстанавіць стабільныя цэны на нафту, газ. Не пагадзіліся. А цяпер хочаце, каб я душыў сваіх вытворцаў і замарозіў цэны на прадукты харчавання. Так не будзе», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы прапанаваў такі варыянт: Беларусь магла б пастаўляць па больш нізкіх цэнах прадукты харчавання і іншыя тавары ў абмен на танную нафту.

Прэзідэнт не выключае, што ў перспектыве імклівы рост цэнаў на энерганосьбіты ў свеце можа прыпыніцца, разам з тым «цэны на беларускую прадукцыю ўзрастуць, гэта значыць мы багацей жыць будзем». У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы лічыць добрым той факт, што Беларусі ўдалося аднавіць прадпрыемствы, што прыйшлі да заняпаду пасля распаду СССР, якія сёння выпускаюць прадукцыю, вельмі запатрабаваную ў свеце.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў таксама важнасць дыверсіфікацыі крыніц паставак энерганосьбітаў. Так, паводле яго слоў, у выпадку ўзнікнення праблем з пастаўкай нафты ад традыцыйнага пастаўшчыка, Беларусь, напрыклад, зможа выкарыстоўваць «чорнае золата», якое здабываецца ў Венесуэле.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Кансультацыя натарыуса

# «АДНО АКНО» НАТАРЫЯТА — ЭКАНОМІЯ ЧАСУ І СІЛАЎ ДЛЯ ГРАМАДЗЯНІНА

**Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 мая 2005 года № 220 карэнным чынам змяніў парадак здзяйснення натарыяльных дзеянняў у бок яго значнага спрашчэння. «Зараз можна з упэўненасцю гаварыць пра тое, што з 2005 года наступіў новы этап у развіцці айчыннага натарыята», — лічыць адзін з кансультантаў «Звязды» па гэтых пытаннях <u>намеснік загадчыка першай Мінскай гарадской дзяржаўнай натарыяльнай канторы Галіна ІВАННІКАВА.</u> Кіруючыся Ўказам № 220, натарыусы сталі першымі, хто пачаў працаваць паводле прынцыпу «аднаго акна», дадае яна.**

### Пры звароце — мінімум дакументаў

Згодна з указам, асобы, якія звярнуліся па здзяйсненне натарыяльных дзеянняў, прадастаўляюць натарыусу толькі дакументы, што сведчаць іх асобу, дзеяздольнасць грамадзян (грамадзянскую дзеяздольнасць), праваздольнасць юрыдычных асобаў, паўнамоцтвы на здзяйсненне такіх дзеянняў ад імя і ў інтарэсах іншых асобаў. Іншыя звесткі і дакументы, неабходныя для здзяйснення натарыяльных дзеянняў, натарыус самастойна запатрабуе ад дзяржаўных органаў і іншых арганізацый Рэспублікі Беларусь. Гэта не адносіцца да звестак і дакументаў, для выдачы якіх патрэбна вынясенне судовай пастановы.

Накіраванне запытаў натарыус ажыццяўляе па вуснай заяве зацікаўленай асобы пасля яго рэгістрацыі ў спецыяльнай кнізе. Дапускаецца запатрабаванне звестак і дакументаў таксама па пісьмовай заяве зацікаўленай асобы, якую можна накіраваць на адрас натарыяльнай канторы па пошце. Але ў дадзеным выпадку сапраўднасць подпісу на заяве павінна быць засведчана натарыусам ці службовай асобай, якой, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, прадастаўлена права здзяйсняць натарыяльныя дзеянні.

Хацелася б адзначыць, што пад зацікаўленай асобай разумеецца грамадзянін, яго прадстаўнік ці прадстаўнік юрыдычнай асобы, ад імя, на імя, па даручэнні або ў дачыненні да якіх здзяйсняюцца натарыяльныя дзеянні. У выпадку, калі за выдачу звестак ці дакументаў прадугледжана плата, дык натарыус накіроўвае запыт толькі пасля атрымання дакумента, што пацвярджае ўнясенне платы.

### Запыт натарыуса не праігнаруеш

На працягу двух тыдняў з моманту атрымання запыту натарыуса арганізацыі накіроўваюць яму неабходныя звесткі і дакументы. Прычым прадугледжаная ўказам адказнасць за непрадастаўленне ці несвоечасовае прадастаўленне натарыусу звестак і дакументаў, якія апошні запрасіў, не дазваляюць ігнараваць запыты, якія паступаюць ад натарыусаў.

Пасля атрымання ўсіх неабходных звестак і дакументаў натарыус накіроўвае грамадзяніну паведамленне. Час здзяйснення натарыяльнага дзеяння заўсёды можна папярэдне ўзгадніць з натарыусам па тэлефоне.

У выпадку запатрабавання звестак і дакументаў натарыусам тэрмін здзяйснення натарыяльных дзеянняў не перавышае аднаго месяца з дня, які ідзе за днём звароту грамадзяніна да натарыуса. Разам з тым зацікаўленыя асобы павінны памятаць, што натарыус здзяйсняе натарыяльныя дзеянні толькі пры наяўнасці ўсіх звестак і дакументаў, а таксама яўкі зацікаўленых асобаў і асобаў, згода або адмова якіх, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, неабходныя для здзяйснення натарыяльнага дзеяння, і аплаты ўсіх плацяжоў, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

### Можна і самому. Але навошта?

Нярэдка можна пачуць пытанне аб магчымасці самастойнага прадастаўлення звестак і дакументаў.

Так, грамадзянін мае права самастойна сабраць дакументы і прадаставіць іх натарыусу. Але хацелася б адзначыць, што з кожным годам ахвотнікаў абцяжарваць сябе гэтай працай робіцца ўсё менш.

Як паказвае практыка, праца органаў натарыята паводле прынцыпу «аднаго акна» цалкам апраўдвае сябе. Натарыусы заўсёды памятаюць, што, з аднаго боку, за кожным дакументам стаіць грамадзянін, чые і правы, і законныя інтарэсы павінны забяспечвацца, з другога — зыходзячы з атрыманых дакументаў, натарыусу даволі часта прасцей вызначыць дакладны пералік дакументаў, якія неабходныя для здзяйснення канкрэтнага натарыяльнага дзеяння.

А яшчэ не менш важным з'яўляецца тое, што ў выніку такой арганізацыі працы ў грамадзян знікла неабходнасць хадзіць па розных інстанцыях і адстойваць шматгадзінныя чэргі, каб атрымаць неабходныя даведкі і дакументы.

**Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.**

Страховой полис ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» **ББ 0086016 считать недействительным.**

## Гранічныя адпускныя цэны на ялавічыну ў Беларусі павялічаны на 2 працэнты, на хлеб — на 3 працэнты

**Гранічныя адпускныя цэны на ялавічыну ў Беларусі з 15 ліпеня павялічаны на 2 працэнты, хлеб і хлебабулачныя вырабы — на 3 працэнты, паведамілі ў Міністэрстве эканомікі. Такое рашэнне змешчана ў пастанове Мінэканомікі № 141.**

Павышэнне гранічных адпускных цэнаў на гэтыя прадукты харчавання ажыццяўляецца ў мэтах паэтапнай кампенсацыі падаражэння сельскагаспадарчай сыравіны, звязанага з павелічэннем цэнаў на паліўна-энергетычныя і матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы, што выкарыстоўваюцца ў сельгасвытворчасці, з улікам стратнасці і нізкай рэнтабельнасці вытворчасці сацыяльна значных харчовых тавараў.

У аддзеле цэнаўтварэння Мінсельгасхарча Беларусі адзначылі, што павелічэнне гранічных адпускных цэнаў на ялавічыну звязана з неабходнасцю пакрыцця падаражэння сыравіны, на якое закупачныя цэны былі павышаны ў чэрвені гэтага года. Апошні раз гранічныя адпускныя цэны на ялавічыну на 2 працэнты павялічыліся 3 чэрвеня гэтага года згодна з пастановай Міністэрства эканомікі № 114.

Што датычыцца павышэння гранічных адпускных цэнаў на хлебабулачныя вырабы, то яно таксама праводзіцца паэтапна. Так, у сакавіку гэтага года яны былі павялічаны на 1 працэнт, у чэрвені — на 1,5 працэнта (згодна з пастановай Мінэканомікі № 114). У Мінсельгасхарчы адзначылі, што гранічныя адпускныя цэны павышаюцца такім чынам, каб не перасягаць прагнозны ўзровень інфляцыі.

У Дэпартаменце па хлебапрадуктах Мінсельгасхарча паведамілі, што павелічэнне гранічных адпускных цэнаў на хлеб і хлебабулачныя вырабы дасць магчымасць часткова пакрыць затраты, звязаныя з іх вытворчасцю з-за росту цэнаў на энерганосьбіты, і іншыя затраты. Цэны на хлеб і хлебабулачныя вырабы будуць у далейшым мяняцца ў адпаведнасці з інфляцыяй. На масавыя гатункі яны павялічваюцца нязначна. Цэны на кандытарскія і іншыя віды вырабаў прадпрыемствы павышаюць у выпадку эканамічнай неабходнасці на ўстаноўлены індэкс змянення адпускных цэнаў, але не больш як на 0,5 працэнта ў месяц.

**БЕЛТА.**

## Суд ацаніў «заслугі» маёра

**Старшы оперупаўнаважаны аператыўнага аддзела папраўчай калоніі № 5 упраўлення Дэпартамента выканання пакаранняў МУС прыгавораны судом Івацэвіцкага раёна да сямі гадоў пазбаўлення волі, паведамляюць у прэс-службе Генпракуратуры Беларусі.**

Пракуратурай Пінскага раёна завершана расследаванне крымінальнай справы, узбуджанай у дачыненні да маёра ўнутранай службы пракурорам Брэсцкай вобласці. Следства ўстанавіла, што гэты супрацоўнік калоніі ўступіў у злачынную змову з асуджаным і выносіў за тэрыторыю папраўчай установы выраблены апошнім нажы. Дарэчы, частка з іх з'яўлялася халоднай зброяй. Прычым рабіў ён гэта не за «дзякуй»: маёр двойчы атрымаў хабар на агульную суму 220 долараў ЗША. За ўчыненае ён прыгавораны да сямі гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі ўзмоцненага рэжыму, канфіскацыяй маёмасці і з пазбаўленнем права на працягу пяці гадоў займаць пасады, звязаныя з ажыццяўленнем функцый прадстаўніка ўлады, у праваахоўных і іншых дзяржаўных органах.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Смерць баксёра не была гвалтоўнай?..

**На мінулым тыдні ў чацвер у сваёй кватэры ў Салігорску быў знойдзены нежывым 38-гадовы беларускі баксёр Віталь Шкраба.**

Загінулы, цела якога з нажом у грудзях знаходзілася ў зачыненай кватэры, быў чэмпіёнам Беларусі ў прафесійным боксе, правёў тытульныя бai з вядомым расійскім баксёрам Мікалаем Валуевым. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» следчы Салігорскай пракуратуры Дзмітрый Дзяшук, цела спартсмена ў абед у чацвер у кватэры знайшла маці. Паводле папярэдняй інфармацыі, смерць баксёра не была гвалтоўнай: следства схіляецца да версіі, што Віталь Шкраба скончыў жыццё самагубствам. На карысць апошняй версіі і тое, што кватэра баксёра была зачынена знутры і знаходзіцца на дзявятым паверсе будынка. Усе акалічнасці гэтага здарэння, па якім следства працягваецца, у пракуратуры пакуль не паведамляюць.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Абзац

■ У Мінскай вобласці шматдзетныя сем'і, якія выхоўваюць 5 і больш няпоўнагадовых дзяцей, атрымаюць аднаразовую грашовую дапамогу на падрыхтоўку да новага навучальнага года. Згодна з распараджэннем аблвыканкама, сума дапамогі на кожнага школьніка складзе Br110 тыс. Грошы сем'і атрымаюць да 15 жніўня.

■ **Дзяржаўтаінспекцыя папярэджвае аб магчымым затапленні некаторых вуліц Мінска ў сувязі з дажджамі. Таму вадзіцеляў просяць быць гранічна ўважлівымі і асцярожнымі, захоўваць хуткасны рэжым і дыстанцыю бяспекі. Затапленне праезнай часткі магчымае на плошчы Бангалор, вул. Няміга, праспекце Дзяржынскага, вул. Харкаўская і Сталетава, скрыжаваннях пр. Пераможцаў — вул. Ігнаценкі, пр. Пушкіна — вул. Прытыцкага, вул. Маскоўская — вул. Талстога.**

■ На тэрыторыі Жыровіцкага Свята-Ўспенскага манастыра ў ноч з 19 на 20 ліпеня адбыўся пажар. Вартаўнік-манах паведаміў пажарным аб узгаранні ў аднапавярховым будынку прадуктовага склада, які пабудаваны ў 1956 годзе. Агнём пашкоджаны дах і перакрыцці. Пацярпелых няма, прычыны ўстанаўліваюцца.

■ **Партыю боепрыпасаў затрымалі беларускія пагранічнікі. У гарадскім пасёлку Астравец ваеннаслужачымі Смаргонскага пагранатрада затрыманы жыхар Астраўца пры спробе прадаць 230 аўтаматных патронаў. Узбуджана крымінальная справа.**

■ За апошнія 14 гадоў колькасць ласёў у Беларусі павялічылася ў паўтара раза. Сёння іх налічваецца каля 15 тыс. Гэтаму спрыяюць умовы надвор'я — мяккія зімы, і дастатак ежы. Больш за ўсё ласёў у Віцебскай вобласці.

■ **Біржа працы Літвы сёлета за першае паўгоддзе выдала дазволы на працаўладкаванне 4,4 тыс. грамадзян замежных дзяржаў. Самую большую частку — 18 працэнтаў замежнікаў, якія працаўладкаваліся, складаюць грамадзяне Беларусі. На другім месцы — грамадзяне Турцыі (16 працэнтаў), затым ідуць Украіна, Малдова і Кітай. Трэць ад усіх замежнікаў, што атрымалі дазвол на працаўладкаванне, складаюць вадзіцелі міжнародных перавозак, 17 працэнтаў — муляры і 9 — зваршчыкі.**

■ У Еўрасаюзе ўведзена забарона на выкарыстанне спецыяльных духовак, у якіх гатуецца качка па-пекінску — славутая кітайская страва, папулярная сярод мільёнаў жыхароў ЕС. Інспектары апячатваюць духоўкі ў рэстаранах у сувязі з тым, што яны не адпавядаюць еўрапейскім нормам выкіду чаднага газу. Забарона на прыгатаванне качкі па-пекінску ўжо ўведзена ў 10 лонданскіх рэстаранах, яшчэ сотні чакаюць яе ў бліжэйшыя тыдні.

■ **Чатырохгадовае брытанскае дзіця загінула ў дзень вяселля сваёй маці. Яна пакінула малога ў машыне, а сама пайшла на манікюр на тры гадзіны. Два падобныя выпадкі за няпоўныя два тыдні адбыліся ў ЗША і Францыі.**

■ У прыгарадзе Чыкага будуць штрафаваць за спушчаныя штаны. Згодна з прынятым нядаўна ўказам, на парушальнікаў будзе накладзены штраф у 25 долараў, калі іх ніжняя бялізна выступае над поясам больш чым на 7,6 см. Улады забаранілі грамадзянам насіць штаны і джынсы ніжэй за талію. Яшчэ раней мэр невялікага амерыканскага гарадка Дэлькабр унёс у гарадскі савет праект закона, згодна з якім нашэнне прыспушчаных штаноў у грамадскіх месцах аб'яўляецца непрыстойным. Кожны, хто выставіць на ўсеагульны агляд ніжнюю бялізну, будзе абавязаны ў лепшым выпадку заплаціць штраф, а ў горшым — правесці за кратамі шэсць месяцаў.

■ **Лейтэнанта паліцыі амерыканскага штата Фларыда звольнілі з працы за тое, што ён патрабаваў бясплатнай кавы ў кафэ. Вартаўнік парадку пагражаў у выпадку адмовы прыязджаць на выклікі са спазненнем. Паліцэйскі быў звольнены пасля таго, як не змог прайсці тэст на дэтэктары хлусні. Да гэтага ён працаваў у паліцыі на працягу 15 гадоў. Супрацоўнікі кафэ расказваюць, што з чэрвеня 2007 года ён заходзіў сюды падчас сваіх дзяжурстваў не менш шасці разоў за ноч. Ён не толькі патрабаваў бясплатных напояў, але і поўнасцю ігнараваў чэргі, становячыся ля барнай стойкі.**

## Поўны абзац

■ Гаспадарчы суд Гомельскай вобласці назначыў штраф таксісту-нелегалу, што з'еў купюру вартасцю Br 20 тыс., якой з ім разлічыліся падаткавікі-кантралёры. Згодна з рашэннем суда, таксісту-нелегалу давядзецца не толькі заплаціць штраф за нелегальны падвоз пасажыраў, але і вярнуць спецыяльна памечаную купюру, якую ён з'еў пасля таго, як кантралёры прадставіліся.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**Правдинский поселковый исполнительный комитет Пуховичского района (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных блокированных жилых домов в д. Сергеевичи Пуховичского района, в том числе:

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Начальная цена |
|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Сергеевичи, ул. Партизанская | 624475504601000172 | 0,1327 га | 205 686 руб. |
| 2 | д. Сергеевичи, ул. Партизанская | 624475504601000173 | 0,1383 га | 214 375 руб. |
| 3 | д. Сергеевичи, ул. Партизанская | 624475504601000174 | 0,1386 га | 214 824 руб. |

***Примечание**: Лот № 1 имеет ограничения в использовании земель (охранная зона ЛЭП 1000 В (0,0013 га).*

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы в сумме 515 701 рубль, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (по каждому лоту). В непосредственной близости имеются сети электроснабжения. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 28.08.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 27.08.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

**Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні Міністру аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Жарко Васілю Іванавічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.**

**Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні Міністру аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Жарко Васілю Іванавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

## У Гомельскай вобласці зноў актывізаваліся лжэработнікі Чырвонага Крыжа і лжэчыноўнікі

**У Гомельскай вобласці зноў актывізаваліся махляркі, якія выдаюць сябе за работнікаў дзяржаўных органаў улады і прадстаўнікоў таварыства Чырвонага Крыжа. Чарговыя факты падману пажылых людзей зарэгістраваны ў Рэчыцы і Рагачоўскім раёне, паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.**

Махляркі дзейнічалі па традыцыйнай схеме. У вёсцы Лучын Рагачоўскага раёна яны, выдаўшы сябе за дзяржслужачых, прапанавалі 78-гадовай пенсіянерцы абмяняць грошы старога ўзору на новыя, запэўніўшы, што цяпер паўсюдна праводзіцца падобны абмен. Жанчына аддала ім Br1 млн 350 тыс., а ўзамен атрымала канверт з чыстымі аркушамі паперы.

Аналагічны выпадак адбыўся ў Рэчыцы, дзе ад ілжэработнікаў таварыства Чырвонага Крыжа пацярпела 77-гадовая жыхарка раённага цэнтра. Яна пазбавілася Br800 тыс.

**Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества**

| Наименование предмета аукциона | Здание сельского совета (почты) и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, Ивановский район, д. Глинно, ул. Советская, 22 |
| Продавец недвижимого имущества | Горбахский сельский исполнительный комитет: Брестская область, Ивановский район, д. Горбаха, тел.: 8 01652 57 2 36, 57 2 35 |
| Характеристика предмета аукциона | Здание 1-эт., **площадь – 51 кв.м**, фундамент – бетонный, стены – брусчатые, перекрытие – деревянное, крыша – шиферная, электроснабжение, отопление печное. Терасса 6 кв.м. **Земельный участок площадью** 0,0707 га, для размещения объектов по оказанию услуг, промышленности, общественного питания, торговли, по согласованию с отделами архитектуры и строительства экономики райисполкома; **срок аренды** – 20 лет. |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 37 913 858 |
| Сумма задатка, руб. | 3 791 300 |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: (0162) 23 12 63, 23 44 06, 20 87 85, www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by* |

Аукцион состоится **22 августа 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал №100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107 , УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома.

3. Юридическими лицами – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

4. Индивидуальными предпринимателями – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранными юридическими лицами – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителями иностранных юридических лиц или иностранных граждан, лиц без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

7. Представителям граждан Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан**: подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае рассрочки), возместить расходы по формированию и государственной регистрации земельного участка; возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Возможно предоставление рассрочки по оплате за право заключения договора аренды земельных участков.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

*Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 21 августа 2008 года включительно.*

УНП 200020538

Здароўе нацыі

# НЕЙРАХІРУРГІ ЎЗЯЛІ НОВУЮ ВЫШЫНЮ

**На мінулым тыдні нейрахірургі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Неўралогія і нейрахірургія» разам з прафесарам Сяртачам Ішлекелем (Універсітэт Эге, г. Эзмір, Турцыя) упершыню ў гісторыі айчыннай аховы здароўя правялі стэрэатаксічныя аперацыі пацыентам са складанай неўралагічнай паталогіяй.**

Як адзначае дырэктар РНПЦ «Неўралогія і нейрахірургія» Сяргей ЛІХАЧОЎ, падобная практыка стала магчымай дзякуючы набыццю абсталявання, якое забяспечвае найвялікшую дакладнасць пры выкананні малаінвазіўных аперацый на галаўным мозгу. Умяшанні такога кшталту выконваліся ў нашай краіне і раней, але не давалі такога станоўчага выніку, які магчымы цяпер. Спецыяльны высокадакладны прыбор дазваляе дабіцца таго, што непрыемныя сімптомы складаных хваробаў праходзяць ужо непасрэдна ў час аперацыі, падчас якой хворы застаецца ў свядомасці.

— Мы запрасілі для ўдзелу ў першых падобных аперацыях высокапрафесійнага спецыяліста, які за дзесяць апошніх гадоў правёў каля 1,5 тысячы стэрэатаксічных аперацый — прафесара Сяртача Ішлекеля, — кажа Сяргей Ліхачоў. — Першую аперацыю правёў менавіта ён, астатнія — ужо нашы нейрахірургі, але ў яго прысутнасці. Трое з пяці праапераваных пакутуюць ад хваробы Паркінсона, складанай паталогіі, якая мае быць у прыкладна 5 тысяч беларусаў. Адной з праяў памянёнага захворвання з'яўляецца дрыжанне канечнасцяў. Чалавек фактычна не можа хадзіць, нават лыжку да роту паднесці... Непасрэдна на аперацыйным стале адбываецца ўздзеянне на пэўны ўчастак галаўнога мозга. Дакладнасць выканання гэтай працэдуры дазваляе знізіць, а пасля і пазбавіць хворага гэтага дрыжання...

Алене Антонаўне Сабіле — адной з праапераваных па прычыне хваробы Паркінсона — 49 гадоў. Працуе намеснікам дырэктара на адной швейнай фабрыцы. «Я не магла сама хадзіць на работу, — кажа Алена Антонаўна на другі дзень пасля аперацыі. — Мяне прывозілі на работу і адвозілі дадому... Моцна дрыжэла правая рука, ногі не слухаліся... Піла шмат таблетак, але яны амаль не дапамагалі... Цяпер вось, бачыце, магу падняць руку, паварушыць пальцамі, сціскаць і расціскаць далонь...».

Паводле слоў прафесара Сяртача Ішлекеля, беларускія нейрахірургі валодаюць тымі ж ведамі, што і еўрапейскія ўрачы. Ім неабходна было толькі «асвоіць» новае абсталяванне — абсталяванне, дарэчы, самай высокай на дадзены момант дакладнасці.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ПЕРАКЛЮЧЭННЕ АБАНЕНТАЎ З НУМАРАМІ 287 25 00 — 287 29 99

Філіял «Мінская гарадская тэлефонная сетка» (МГТС) РУП «Белтэлекам» 23 ліпеня правядзе пераключэнне абанентаў са змяненнем нумарацыі, паведамілі на прадпрыемстве.

У сувязі з пераключэннем абанентаў на электронную АТС нумарацыя зменіцца наступным чынам: тэлефонныя нумары 287 25 00 — 287 29 99 будуць заменены на 290 45 00 — 290 49 99.

Пасля завяршэння пераключэння на старыя нумары будзе ўстаноўлены аўтаінфарматар, які паведамляе новы парадак набору нумару.

**Кар. БЕЛТА.**

Міграцыя

# Больш замежнай рабочай сілы — больш парушэнняў?

**Айчынны рынак працы актыўна развіваецца ў апошнія гады, і патрабуе ўсё больш рабочых рук. Прычым гаворка ідзе не толькі пра высокакваліфікаваную дзейнасць (такія спецыялісты заўсёды ў цане), але і пра цалкам процілеглы, як кажуць, нізкакваліфікаваны занятак.**

**Нягледзячы на тое, што самі беларусы спрабуюць шукаць лепшых заробкаў у замежжы, у нашу краіну тым часам імкнуцца замежнікі. Згодна з данымі Міністэрства статыстыкі і аналізу, для часовай работы ў краіну былі запрошаны летась 1496 чалавек (у 2006-м — 922, 2005-м — 651, 2004-м — 530).**

Беларусь зацікаўлена ў дадатковых работніках і не мае на мэце абмяжоўваць выкарыстанне замежных рабочых рук. Ва ўсякім разе, спецыяльнай квоты па працаўладкаванні іншаземцаў пакуль не ўстанаўлівалася. Аднак вышэйпамянёная практыка павінна ажыццяўляцца выключна ў межах устаноўленых правілаў. Важна таксама ўлічваць, што дзяржаўная праграма занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2008 год прадугледжвае прыярытэтнае прадастаўленне рабочых месцаў грамадзянам Беларусі.

Паводле слоў начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Лідзіі ІВАНЧЫКАВАЙ, цяпер прыцягненнем замежнай працоўнай сілы ў нашай рэспубліцы могуць займацца звыш 700 беларускіх наймальнікаў, якія атрымалі адпаведныя ліцэнзіі. Іншаземцы ў нашай краіне заняты на сельгасработах, будаўніцтве ў сельскай мясцовасці, у якасці спецыялістаў па абслугоўванні імпартнага абсталявання, кіраўнікоў прадпрыемстваў, спартсменаў-інструктараў. Патрэба прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання ў прыцягненні замежных грамадзян абумоўлена, напрыклад, адсутнасцю сярод тутэйшага насельніцтва спецыялістаў, якія валодаюць навыкамі прыгатавання нацыянальных страў. Работнікі-мігранты прыязджаюць з Расіі, Украіны, Латвіі, Арменіі, Грузіі, В'етнама, Кітая і іншых краін.

— Шэраг праверак, праведзеных нашымі падраздзяленнямі ў чэрвені, паказаў, што ў цэлым дзейнасць па прыцягненні ў краіну замежнай рабочай сілы ажыццяўляецца згодна з патрабаваннямі дзеючага заканадаўства, — кажа Лідзія Іванаўна. — Аднак былі выяўлены і парушэнні. Так, у Мінску ТАА «Нівіртбел» дапусціла шматлікія парушэнні ліцэнзійных патрабаванняў і ўмоў: падчас першай праверкі высветлілася, што сямёра грамадзян Малдовы працавалі без афармлення спецыяльнага дазволу. Падчас правядзення паўторнай праверкі зноў былі выяўлены пяцёра малдаван, якія працавалі без спецдазволаў. Выяўлены і факты парушэння заканадаўства прадпрыемствамі, якія не маюць ліцэнзій на права прыцягнення замежнай рабочай сілы — у кафэ «У сяброў» ПУП «Ювейсэрвіс» незаконна працавалі двое грамадзян Арменіі, у аптэцы ТАА «Нова Фарм» у якасці правізара без спецыяльнага дазволу працаваў таксама грамадзянін Арменіі. ПУП «Футбольны клуб «Савіт» г. Магілёва прыцягваў без рэгістрацыі і спецыяльных дазволаў на права ажыццяўлення працоўнай дзейнасці ў якасці спартсменаў-інструктараў пяцёра замежных грамадзян з Расіі, Украіны, Бразіліі і Кот-д'Івуара. У філіял № 7 ААТ «Белтрубаправодбуд», размешчаны ў Валожынскім раёне, быў незаконна прыняты на работу ў якасці слесара грамадзянін Латвіі. Аналагічныя парушэнні выяўлены падчас праверкі філіяла «ММК-АГРА» КУП «Мінскі мясакамбінат». Асобы, якія парушылі заканадаўчыя нормы, прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. Неабходна яшчэ раз нагадаць, што замежныя фізічныя асобы атрымліваюць доступ на нацыянальны рынак працы пасля заключэння кантракта з наймальнікам Рэспублікі Беларусь, які мае ліцэнзію Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі на ажыццяўленне дзейнасці, звязанай з прыцягненнем замежнай працоўнай сілы...

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Простыя рэчы

# ХВОЯ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Адразу трэба сказаць, што ў беларускай мове раўнапраўна існуюць дзве назвы гэтага дрэва, якое па лацінску гучыць *Pinus silvestris*. У нас жа альбо хвоя, альбо сасна. Слоўнікі, праўда, аддаюць перавагу хвоі. І ў той жа час Вацлаў Ластоўскі, ствараючы свой слоўнік «Расійска-крыўскі (Беларускі)» і стараючыся знайсці адпаведнікі, якія б замянялі расійскія словы, хвою падаў як сосна, праўда, з націскам на літары «о». А ў беларускай літаратуры гэтыя два словы пануюць раўнапраўна.

Гэта род вечназялёных дрэў. На Беларусі больш за 20 відаў. Але мы, як правіла, мала разбіраем іх у лесе. Хвоя, ці сасна яны і ёсць хвоя, ці сасна. Між іншым, гэта вельмі святлолюбівыя, хуткарослыя дрэвы. А жывуць яны да 300—500 гадоў. Драўніну хвоя мае вельмі высокай якасці. З яе робяць мэблю ды і шпалы, і тэлеграфныя слупы раней рабілі, пакуль не перайшлі на жалезабетонныя. З жывіцы хвоі выраблялі і шкіпінар, і каніфоль. А з маладойігліцы — канцэнтрат вітаміну С, эфірны алей.

А ўспомнім такі выраз — карабельныя сосны. Некалі ішла стромкая, высозная хвойка на пабудову караблёў, на мачты для іх.

Вось як у Якуба Коласа:

*Люблю я лес, адвечны бор,*
*Дзе ўзносяць хвоі ўгору шапкі.*

І ўсміхаецца Хведар Чэрня:

*Зялёны ранак сонечнай нядзелі*
*Не можа радасць цішыні ўтаіць.*
*Відаць, субота добра пагудзела,*
*Калі у хвоях шум яшчэ стаіць.*

І ў той жа час у Максіма Танка ёсць цудоўны зборнік паэзіі, які так і называецца «Нарачанскія сосны». Ды і ўвогуле сасна ў яго творчасці прысутнічае пастаянна.

*Ты, сасна, ці помніш прызбы*
*і парканы,*
*На якіх з-пад малака збаны сушылі,*
*І пляткарылі сарокі кожны ранак,*
*І спявалі пеўні,*
*разгарнуўшы крылы?*
*Як я рад, сасна,*
*што ты ўсё помніш гэта.*
*І зайздрошчу,*
*што знайшла ў сабе ты сілы*
*Зелянець ізноў,*
*спяваць зімой і летам*
*Тут, дзе я стаю, маўклівы і пахілы.*

А ў Івана Навуменкі ёсць два цудоўныя раманы аб вайне. «Сасна пры дарозе» і «Вецер у соснах». Не па абавязку студэнта, а з задавальненнем прачытаў некалі гэтыя раманы аб маладых людзях, якія патрапілі ў ліхалецце вайны. І не зламаліся, засталіся вернымі сваім ідэалам. Там шмат сімвалаў. Напрыклад:

«Дзіўна, як уцалела гэта адзінокая сасна і чаму за доўгія гады не вырасла паблізу хоць маленькай сасонкі?»

А колькі ў нас у Беларусі населеных пунктаў — Сасновак. Ды і санаторыі «Сасноўка» пад Віцебскам, «Сосны» — на Нарачы.

Увогуле, нарачанская сасна — гэта не проста хваіны, якія растуць ля возера, ды яшчэ і паэтам апетыя. Магчыма, з-за асаблівасцяў глебы, магчыма, з-за асаблівасцяў клімату гэтага краю, але хвоі-сосны тут своеасаблівыя. Высокія, прыгожыя, шумлівыя ў непагадзь, калі вецер разганяецца па Нарачы і ўрываецца ў іх кроны. А які ад іх пах! Пасля таго, як крыху прыхапіла сэрца і ўрачы настойліва параілі штогод бываць у санаторыі — у мяне не было ніякіх памкненняў на славутыя курорты, хоць прапаноўвалі і Есентукі, і нешта іншае. Толькі Нарач. Стараўся выбрацца туды восенню. Набраўшыся сілы, маладыя парасткі на соснах пахнуць асабліва. А якая цішыня і спакой на сцежках! Ад маіх Пастаў да Нарачы пару дзесяткаў кіламетраў. А вось нарачанская сасна і наша, пастаўская хваіна нечым розняцца, не на карысць нашай. Дарэчы, гэта адзначалі і старыя людзі. Атрымаць нарачанскую сасну для будаўнічых мэтаў лічылася заўсёды вялікай справай.

Нездарма сёння і возера, і нарачанскія сосны пад пільнай аховай дзяржавы. Тут створаны Нацыянальны парк «Нарачанскі». Таму нават заехаць у нарачанскія лясы няпроста. Пра нейкую ж гаспадарчую дзейнасць і размова не ідзе.

А там дзе хвоі — там бор. Бары ў нас на Віцебшчыне яшчэ захаваліся цудоўныя. Старыя, высокія, яны растуць менавіта на грудках, узвышшах. Капанеш там зямлю — суцэльны пясок. А бач ты, якія гіганты вырастаюць. У Янкі Купалы:

*Верасы пад лісцем спалі,*
*Бор зялёны гнуўся,*
*Недзе пелі ў цёмнай далі*
*Журавы ды гусі.*

І ў Цёткі:

*Бягу думкай у край далёкі,*
*У лес цёмны, у бор высокі.*

Здаўна прыдумаў бору беларус і гаспадарчую функцыю, не шкодзячы яму. Яшчэ гадоў дзесяць таму ў Докшыцкім раёне давялося браць удзел у такой справе: выкапалі восенню бульбу і вязуць яе не ў вёску (нізінная вёска), а ў недалёкі хваёвы бор. Тут выкопваюць яміну-капец і засыпаюць бульбу на захоўванне. Зверху салому, жэрдкі, зямлю — мароз не прыхопіць. А вады ў гэтым высокім бары ніколі не бывае. Дарэчы, недалёка, таксама ў гэтым бары былі і вясковыя могілкі. Людзям у сухім таксама класціся весялей. А ў нас жа і магілы называюць капцамі.

Згадалася: дык і мае ж прадзеды, дзяды, бацька, радня памерлыя ляжаць альбо ў барах хваёвых, альбо ў невялікіх барках, але менавіта пад хвоямі. Іх цяпер на могілках пачалі пакрысе выразаць. Магчыма, так і трэба — старыя, вятры могуць паваліць. Але без сасны на могілках неяк сумнавата і ніякавата. Асабліва калі пакідаецца толькі пара-тройка маладзейшых дрэў. Міжволі ўспамінаецца тады народнае мудраслоўе:

**Заблудзіць у трох соснах** — страціць нейкія жыццёвыя арыенціры, разгубіцца.

Зазірнуў у «Геаграфію Беларусі» Аркадзя Смоліча. Зразумела ж, ён змясціў фотаздымак хваёвага бору. І раптам побач бачу малюнак: тайга зімою на Віцебшчыне. Былі невялікія яе ўчасткі ў нашых мясцінах яшчэ гадоў сто таму.

Адразу пасля вайны краіне вельмі шмат патрэбна было лесу. Адбудоўвалі спаленае і разбуранае. І таму ў нашых мясцінах вяскоўцам, яшчэ аднаасобнікам, даводзіліся заданні па нарыхтоўцы і вывазцы лесу. Называлі ў вёсцы гэта «ездзіць на кубы». Бо заданні даводзіліся ў кубаметрах. Але адначасова вяліся работы і па аднаўленні лесу, яго пасадцы. Вось на такіх работах працавала маладой дзяўчынай і маці. Яшчэ ў маім дзяцінстве, калі хадзілі мы ў родную вёску, яна паказвала з гордасцю маладыя пасадкі хвоек. «Тут і маёй працы шмат.» Сёння, калі зрэдку праязджаю праз гэтыя мясціны, бачу, што пасадак маладых няма. Стаіць высокі, яшчэ не зусім спелы, а ўжо моцны лес. Пасаджаны, магчыма, і загуста ён вельмі вабіць грыбнікоў. Тут баравіковы край. Ды я і не першы пра такое сказаў. Алег Лойка:

*І я ўспомніў, як світаннем*
*У густыя хвайнякі,*
*Бы да любай на спатканне,*
*Бег збіраць баравікі.*

Я жыву ў хаце, якая зрублена з хваёвых бёрнаў. У пачатку пяцідзесятых бацька купіў у вёсцы і перавёз у Паставы ўжо гатовы і паслужылы людзям зруб. А на трысцень да яго нарыхтоўвалі хваёвыя бёрны самі. Мясцовая ўлада давала дазвол, вызначала месца, дзе можна высякаць дрэва — а далей старайся сам. Бясспрэчна ж, гэта не нарачанская сасна. Але хвоя трапілася здаровая, моцная. Служыць і будзе служыць роднай хаце надалей.

І што яшчэ вельмі падабаецца ў хваёвым бары — гэта дол, засланы ігліцай. У нас яшчэ ігліцу называюць хвойкай. Ёсць прымаўка:

*Хоць хвойку жую,*
*Але на волі жыву.*

Ідзеш па такім лесе нібы па якім персідскім дыване. Ды пах ад іх восенню — непаўторны.

Уладзімір Дубоўка, мой зямляк, па волі лёсу дваццаць гадоў правёў у далёкай Сібіры. Пабачыў ён там тайгі і не нашай, апісанай Смолічам, а суровай, сапраўднай. І вось з яго ўспамінаў:

«Ігліца кедровая намнога даўжэйшая ад сасновай, а галоўнае — у сасновай па дзве іглінкі ў пучку, а тут па чатыры.» Колькі за гэтай фразай прыхавана. І ўспаміны пра вымушаную ссылку, і любоў да роднага, да той жа простай сасны, якая, відаць, у далёкім краі шчымліва ўспаміналася, калі бачыў сібірскія кедры.

І завяршу невялікай вытрымкай са свайго верша.

*На лясной старасвецкай дарожцы,*
*Не ўкатанай вагою машын,*
*Толькі кропелькі сонца па крошцы*
*Ды ігліцы сівой спарышы...*
*Будзь працейшым.*
*І чырвань, і срэбра —-*
*Вось ля гэтай спакойнай сасны.*
*Шмат не трэба.*
*Нам шмат жа не трэба...*
*Толькі сонечнай ласкі ў вясны.*

**Алесь КАСЦЕНЬ,**
*г. Паставы.*

К'РМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 21 (589)
аддзел рэкламы ☎ 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

***ПРАДАЕЦЦА***

■ Дом у г. Клецку 10,5х6,5, пячное ацяпленне, праводзіцца газ, участак 9 сотак.
Тэл. 8 01793 54 763, 8 029 102 89 65.

■ Кватэра 3-пакаёвая, кааператыўная, маецца тэлефон, гараж, у райцэнтры Гарадок, нядорага.
Тэл. 8 029 216 17 09, 8 0212 48 08 09.

■ Кватэра 2-пакаёвая ў г. Мінску па вул. Асіпенкі.
Тэл. 8 017 233 33 40, сот. 325 67 07.

■ Зруб 6х8 пад дахам, з вокнамі і дзвярамі, маюцца будматэрыялы.
Тэл. 8 01646 2 39 950, сот. 390 38 07.

■ Электрастанцыя стацыянарная, магутнасць 0,65 кВт., б/к.
Тэл. 8 02132 41 375.

■ «Мерседэс» 124Е, 2,0Д, 1994 г.в.
Тэл. 8 029 681 24 38.

■ Мікрааўтобус «Івека дэйлі» 1991 г.в., 2,5Д, 15 месцаў (для арганізацыі), 13,2 млн рублёў.
Тэл. 8 029 617 16 97, 8 029 285 02 59.

■ УАЗ 452А, прычэп УАЗаўскі, з/ч да ГАЗ-52, 53.
Тэл. 8 029 805 17 56.

■ «Фіят-тэмпра» 1991 г.в., 1,9Д, бардовы металік, седан, 1600 у.а.
Тэл. 8 029 596 88 22.

■ Рабочая кабыла, узрост 11 гадоў.
Тэл. 8 01771 44 356.

***КУПЛЮ***

■ Гараж у г. Мінску (у раёне Партызанскага праспекта), разгледжу варыянты.
Тэл. 8 029 145 11 97.

■ Трактар МТЗ.
Тэл. 8 029 655 07 16.

■ Старажытныя манеты, узнагароды — дорага.
Тэл. 8 029 553 43 66.

■ Аўтамабіль «Аўдзі» ці «VW» з 1988 па 2001 г.в., можна з дэфектамі, магчымы варыянты.
Тэл. 8 029 145 11 97.

■ Шчаня шпіца чорнага з чырвона-рудым падпалам у Мінску ці Мінскім раёне.
Тэл. 8 017 272 20 02, 8 029 161 81 61.

■ Магазін, офіс.
Тэл. 8 029 682 14 42.

■ Арачнік, ангар.
Тэл. 8 029 778 33 38.

***РОЗНАЕ***

■ Мяняю дом з усімі выгодамі ў вёсцы на кватэру ў Мінску, даплата, даўгі, або прадам.
Тэл. МТС 820 37 43.

■ Мяняю 2-пакаёвую прыватызаваную кватэру ў Віцебску і 3-пакаёвую кааператыўную з гаражом у райцэнтры Гарадок з даплатай на кватэру ў Мінску ці Санкт-Пецярбургу.
Тэл. 8 029 216 17 09.

■ Выканаем усе будаўнічыя работы, хутка і якасна.
Тэл. 8 029 761 87 25.

ЗВЯЗДА
КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Пашпарт серыя____________ №__________________ Выданы______________________________

Подпіс______________________ Дата______________________

ТЕХНОБАНК

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2008 г.

**Наименование банка** *(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2008 г. | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 6847,7 | 5282,5 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 6669,8 | 5728,8 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | | 9038,6 | 7931,1 |
| | для торговли | 11031 | 3 | 9019,6 | 7912,1 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3.1 | 0,0 | 0,0 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3.2 | 19,0 | 19,0 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 31845,0 | 24970,0 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 145937,4 | 92058,2 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | 47,9 | 47,9 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 7319,1 | 6397,7 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 18096,4 | 20110,9 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | | 225801,9 | 162527,1 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | 0,0 | 0,0 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 76861,1 | 32291,4 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 84918,1 | 69648,6 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 12421,3 | 42,1 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 14919,4 | 27133,8 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 189119,9 | 129115,9 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 19985,3 | 19968,9 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,0 | 0,0 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 7249,3 | 5249,2 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 3711,9 | 3148,7 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 5735,5 | 5044,4 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | 36682,0 | 33411,2 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 225801,9 | 162527,1 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | 87046,5 | 59126,2 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | 67270,0 | 49348,9 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2008 г.

**Наименование банка ОАО «ТЕХНОБАНК»** *(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2008 г. | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 4100,1 | 4493,2 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 4087,3 | 3953,6 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 12,8 | 539,6 |
| 4 | Комиссионые доходы | 2021 | | 4191,6 | 2615,2 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 811,8 | 491,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 3379,8 | 2123,6 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | 4706,6 | 2892,2 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | -3,7 | -3,7 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 0,0 | 0,0 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 804,7 | 44,2 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 305,0 | 9362,4 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 5506,6 | 13178,1 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 379,4 | 315,5 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 390,7 | 216,8 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 1319,1 | 1159,5 |

**Руководитель** **В.И. Хлопицкий**
**Главный бухгалтер** **Н.Л. Борсук**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г.*

### ПАЙШЛІ З ПОЛЯ, ЗАСТАЛІСЯ Ў ФУТБОЛЕ

У суботу на сталічным «Дынама» адбыліся провады з вялікага футбола беларускіх футбалістаў Аляксандра Хацкевіча і Генадзя Тумiловіча. Але абодва ветэраны засталіся ў гульні № 1: Хацкевіч трэніруе юніёрскую зборную Беларусі і ФК «Віцебск», а Тумiловіч працуе спартыўным дырэктарам мінскіх дынамаўцаў. Ігракі правялі традыцыйны ў такім выпадку развітальны матч, удзел у якім узяў леверкузенскі «Баер». Сустрэча завяршылася нічыйным лікам — 2:2.

### БАТЭ НЕ ЗДАЕ ПАЗІЦЫЙ

У заключным туры першага круга лідары вышэйшай лігі па футболе ўзмацнілі сваё становішча: пасля перамогі над «Віцебскам» (2:0) барысаўскі БАТЭ набірае 37 ачкоў. Падапечныя Віктара Ганчарэнкі не ведаюць паражэнняў у чэмпіянаце Беларусі (11 вікторый і 4 нічыйныя зыходы). Самы буйны лік 15-га тура быў зафіксаваны ў Магілёве, дзе мясцовы «Днепр» разграміў «Смаргонь» — 5:0. Вынікі іншых матчаў: «Дынама» (Мінск) — «Савіт» (Магілёў) — 3:2, «Дарыда» (Мінскі раён) — «Шахцёр» (Салігорск) — 0:2, «Тарпеда» (Жодзіна) — «Нафтан» (Наваполацк) — 0:3. «Нёман» (Гродна) — «Граніт» (Мікашэвічы) — 0:1, «Дынама» (Брэст) — «Лакаматыў» (Мінск) — 1:0. Паядынак МТЗ-РІПА — «Гомель» прайшоў учора вечарам.

Тэніс. Кубак Дэвіса

# ЗНОЎ НАСТУПІЛІ НА ПОЛЬСКІЯ ГРАБЛІ

## Беларусы другі раз прайгралі палякам у матчы Кубка Дэвіса з лікам 1:4

За адным толькі выключэннем — мінулая сустрэча праходзіла на корце нашых суседзяў, ну і зразумела, што дванаццаць гадоў таму склады камандаў адрозніваліся ад цяперашніх. На жаль, зборнай нашай краіны не ўдалося ўзяць рэванш, хоць напярэдадні матча ў Мінску лідар беларусаў Максім Мірны пераконваў карэспандэнта «Звязды», што нельга параўноўваць моц той і сённяшняй зборнай:

— У 1996-м мы былі яшчэ маладымі, гуляць нам тады давялося супраць тытулаваных іракоў не на самым нашым любімым, земляным пакрыцці, — узгадваў Максім пасля жараб'ёўкі ў чацвер. — Было дастаткова фактараў супраць нас, адсюль і вынік — паражэнне. Цяпер жа мы набылі багаты вопыт, а яшчэ мы выступаем дома.

Аднак зборная Польшчы ўзору 2008 года таксама аказалася для нашых тэнісістаў крэпкім арэшкам, хоць першы і другі нумар каманды не прыехалі на турнір. У заяўцы капітана гасцей Радослава Шыманіка былі цудоўны парны дуэт ляўшы і праўшы Марцын Маткоўскі — Марыюш Фірстэнберг, якія маюць 6 тытулаў у парным разрадзе, узыходзячая «зорка» тэніса, таленавіты юніёр Ежы Яновіч і Міхал Пшышэзны, які толькі аднавіўся пасля траўмы.

Калі пятніца аказалася для нашай каманды «сухой»: беларусы ўступілі палякам у абодвух матчах першага дня Кубка Дэвіса (аб гэтым «Звязда» пісала ў суботу), то субота, наадварот, выдалася мокрай у прамым сэнсе гэтага слова. З-за дажджу парная сустрэча пераносілася на працягу ўсяго дня ажно да 19 гадзін, а ў выніку моцных ападкаў атрымала адтэрміноўку да нядзелі. Аднак раніцай у нядзелю ў Мірнага і Валчкова была тэмпература пад 39 градусаў. Паводле слоў Дзмітрыя Татура, першага і другога нумара беларусаў зваліла з ног вірусная інфекцыя. «А што вы хочаце? Яны ўжо звыш 15 гадоў у Кубку Дэвіса, гуляюць пры экстрэмальных нагрузках, за што Мірнаму і Валчкову даўно варта паставіць памятнік пры жыцці. А ў такой сітуацыі траўмаў і хваробаў не пазбегнуць», — растлумачыў капітан. Нічога не заставалася, як выпусціць на корт навічка 20-гадовага Катлярова і 19-гадовага Каратчэню (на фота). Цікава, што калі ў чацвер я пацікавілася ў юнакоў, ці вераць яны, што згуляюць супраць палякаў, пачула зусім розныя адказы. Андрэй быў упэўнены ў гэтым, бо нездарма ж капітан сказаў рыхтавацца, настройвацца на матч. А вось Павел верыў, што зможа ўзяць ракетку ў рукі толькі, калі лік будзе 3:0 на карысць гаспадароў. Бліжэй да рэчаіснасці аказаўся Каратчэня. Маладым даверылі-такі выступіць, калі лідары захварэлі.

Нічога дзіўнага ў тым, што беларуская пара ўступіла палякам ў парным матчы, няма. Верх узялі вопыт, зладжанасць у дзеяннях замежных іракоў. Павел Катляроў паспрабаваў растлумачыць прычыны паражэння (6:4, 6:0, 6:2): «Мы занадта хваляваліся, бо гулялі супраць вопытных парнікаў, якія ў свой час уваходзілі ў дзесятку лепшых тэнісістаў, мы ж гулялі разам толькі некалькі разоў на юніёрскіх турнірах. Акрамя таго, мы даведаліся, што выйдзем на корт толькі ранкам у дзень гульні, таму проста не былі гатовыя да яе, рабілі недапушчальныя памылкі. Галоўнае, што гэты матч стаў для нас добрай школай, бо неўзабаве нам давядзецца замяніць Мірнага і Валчкова». Сапернікі Марцын Маткоўскі і Марыюш Фірстэнберг далі свой каментарый да гульні маладых беларусаў:

— Напярэдадні матча мы даведаліся аб замене ў складзе беларусаў, таму зразумелі, што мы фаварыты. Можна зрабіць выснову, што перамога далася нам лёгка, але гэта не так. Аб гульні вашай пары хацелася б сказаць, што ў яе былі праблемы на прыёме. Тэнісісты занадта мітусіліся ля сеткі. Аднак мы бачылі, што вашы іракі вельмі стараліся.

У нядзелю адбыліся і адзіночныя матчы. Першая ракетка гасцей Міхал Пшышэзны хуценька расправіўся з дэбютантам матча Паўлам Катляровым — 6:1, 6:2, і адразу пасля паядынку пабег да машыны, каб адбыць у аэрапорт. Пэўна, ён быў настолькі ўпэўнены ў сабе, што заказаў білеты ўпрытык. У другім паядынку сустракаліся Ежы Яновіч, які ў пятніцу ўцёр нос Мірнаму ў трох сэтах, і Андрэй Каратчэня. Самы малады беларускі ўдзельнік падарыў балельшчыкам адзіную ў матчы перамогу (3:6, 6:2, 6:4), хоць у пачатку гульні, здавалася, паляк не дазваляў нашаму іраку навязваць сваю гульню. Дарэчы, у час трэцяга сэта беларускі бок узяў медыцынскую паўзу, каб зрабіць Каратчэні масаж. Не дзіва, бо юнак гуляў ужо другі матч у нядзелю. Пасля перамогі Андрэй прызнаўся, што гэты перапынак стаў ключавым момантам, які і дазволіў яму ачуняць і дамінаваць над сапернікам. Ежы Яновіч заявіў пасля пройгрышу, што ў яго проста не было вялікай матывацыі выйграваць, бо перамога ў матчы Беларусь — Польшча ўжо не сплывала ад яго каманды. Капітан жа беларусаў заверыў журналістаў, што юніёры — гэта такія іракі, якія ніколі не аддаюць перамогу, бо ім яшчэ шмат чаго даказваць, вось яны і змагаюцца да апошняга незалежна ад сітуацыі.

— Мне было цяжка, бо я вельмі хацеў узяць ачко ў дамашнім матчы, — узгадаў аб сваім настроі перад гульнёй Андрэй Каратчэня. — А яшчэ я вельмі хваляваўся, што пойдзе дождж (кроплі вады пакаціліся на корт адразу пасля пятай гульні. — **Аўт.**). Ці змог бы я выйграць у Ежы, калі б выйшаў на корт у першы дзень? Цяжка адказаць. Адзінае, у чым я перакананы, што з гэтым тэнісістам мы сустрэнемся яшчэ не раз на турнірах, бо мы ж амаль равеснікі.

Такім чынам, Беларусь уступіла Польшчы другі раз у гісторыі Кубка Дэвіса усё з тым жа лікам — 1:4. «Я не чакаў, што мы выйграем з такой перавагай, — сказаў капітан палякаў пасля турніру. — У Мінск мы ехалі толькі перамагчы!»

У верасні нашай зборнай давядзецца змагацца за выжыванне ў першай групе Еўра-Афрыканскай зоны. Нам зноў пашанцавала на правядзенне матча дома. Праўда, як паказала практыка, гэта не гарантыя поспеху. У Мінск прыедзе зборная Грузіі, якая мае добрыя традыцыі ў тэнісе. Пакуль жа ёсць час на асэнсаванне сваіх памылак. Адну з іх ужо знайшоў Дзмітрый Татур:

— Заўжды лёгка ацэньваць дзеянні пасля матча. Зараз я гатовы прызнаць, што ў першы дзень, магчыма, памыліўся, калі адправіў на бой ветэранаў. Аднак гэты ход доўга абмяркоўваўся трэнерскім штабам, і гэта рашэнне тады здавалася правільным.

Капітан паставіў кропку ў сваім рэзюме на аптымістычнай ноце: «Нягледзячы на серыю паражэнняў, у нас ёсць не толькі негатыў, але і пазітыў. Мы праверылі юніёраў. Мірны і Валчкоў абавязкова будуць дапамагаць нам і надалей, але ў нас ёсць таленавітыя маладыя іракі — Валодзя Ігнацік, Андрэй Каратчэня і іншыя». Прычыну ж паражэнняў Дзмітрый Татур бачыць у тым, што сур'ёзна развіваць тэніс у нашай краіне пачалі адносна нядаўна, з прыходам у БАТ мэра Мінска Міхаіла Паўлава. «Тэніс базуецца на трох кітах — месца трэніровак, арганізацыя трэніровачнага працэсу і фінансаванне, — кажа капітан. — Праз 5—7 гадоў нашы намаганні дадуць плён».


Фота Вольгі ЛАСКІ.

**Ірына ПРЫМАК.**

Наўздагон

# «БАЗАР» БУДЗЕ САМААКУПЛЯЦЦА!

**Білеты на мерапрыемствы «базару» павінны прадавацца ва ўсіх абласцях, сталіцы, а таксама распаўсюджвацца праз Інтэрнэт. І турыстычныя аператары проста абавязаны як мага больш людзей прывозіць у Віцебск у дні «базару». Арганізатарам трэба пастарацца зрабіць усё, каб ён самаакупляўся. І такія магчымасці ёсць.**

Ужо ў наступным годзе «Славянскі базар у Віцебску» можа стаць такім маштабным гандлёвым і бізнэс-кірмашом, як знакаміты Ніжагародскі. І тут прадставіць сваю прадукцыю айчынныя вытворцы. Ёсць неабходнасць пабудаваць на радзіме фестывалю «пяцізорны» гатэль.

Такія грандыёзныя планы агучыў у Віцебску пасля завяршэння «базару» **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі, старшыня арганізацыйнага камітэта па правядзенні фестывалю Аляксандр КОСІНЕЦ**. Ён зрабіў абгрунтаваную эканамічную «раскладку», выступаючы перад прадстаўнікамі СМІ. А потым прайшло пасяджэнне арганізацыйнага камітэта фестывалю, падчас якога па традыцыі падвялі вынікі ўжо мінулага фестывалю.

Ужо наступны міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» будзе не пазнаць. У прыватнасці, віцэ-прэм'ер адзначыў наступнае: «Паспела неабходнасць прадставіць на фестывалі нацыянальныя мастацтвы Афрыкі, Амерыкі, Еўропы».

У сярэднім напаўняльнасць залы ў Летнім амфітэатры (тут цяпер больш за 6 тысяч месцаў для гледачоў) каля 70 працэнтаў. І штогод гэты паказчык паўтараецца. Не сакрэт, што неахвотна купляюць білеты на конкурсныя канцэрты з удзелам маладых выканаўцаў. Як падкрэсліў віцэ-прэм'ер, у два конкурсныя дні напаўняльнасць гледачамі амфітэатра толькі 15 — 35 працэнтаў. Таму трэба перагледзець канцэпцыю арганізацыі конкурсу.

Дарэчы, летась у рэканструкцыю амфітэатра, мадэрнізацыю светлавога і гукавога абсталявання ўклалі 47 мільярдаў беларускіх рублёў. Каб заўсёды купляліся ўсе білеты, трэба арганізоўваць запатрабаваныя канцэрты. Штогод пры поўным напаўненні залы (не толькі ў «базарныя» дні») можна зарабіць 6 мільярдаў. Таму, на думку кіраўніка аргкамітэта, білеты трэба прадаваць не толькі ў Віцебску. Вось на сёлетні «базар» санаторна-курортныя арганізацыі прывозілі цэлыя аўтобусы з гасцямі, надалей трэба павялічыць іх колькасць. І з-за мяжы таксама, у чым, паводле слоў Аляксандра Косінца, паспрыяюць беларускія дыпламаты.

Неабходна больш актыўна рэалізоўваць правы карыстання фірмовым знакам «базару». Толькі нядаўна (у мінулым месяцы) «васілёк» спатрэбіўся для нанясення на сваю прадукцыю ўсяго 16 прадпрыемствам і арганізацыям, але іх можа быць у разы болей. Чаму б такую магчымасць не прапаноўваць гасцям фестывалю? У выніку можна атрымаць значнае паступленне грошай. Віцэ-прэм'ер упэўнены, што трэба актыўна развіваць турыстычную галіну і прыдарожны сэрвіс у суседніх з Віцебскам гарадах — Лёзне, Гарадку, Бешанковічах і іншых — і там, у прыватнасці, будаваць гатэлі. «Гэта будзе спрыяць не толькі развіццю фестывалю, але і задавальняць патрэбнасці людзей, пойдзе на карысць развіццю эканомікі рэгіёнаў, вобласці і краіны ў цэлым», — канстатаваў Аляксандр Косінец.

Нязменны кіраўнік дырэкцыі «базару» Радзівон БАС заявіў, што ўжо ёсць прапановы правесці на наступным фестывалі Дні культур Казахстана, Грузіі, Балгарыі. Нават запланавалі арганізаваць чартарны авіярэйс са сталіцы Казахстана ў Віцебск, каб перавезці артыстаў і гасцей — каля 100 чалавек.

Як адзначыў спадар Бас, на мінулым фестывалі прадстаўнікі тых краін, што былі прадстаўлены тут упершыню, былі поўныя прыемных уражанняў.

«Так некаторым спадабалася, што не без цяжкасцяў адправілі іх дадому», — пажартаваў Радзівон Міхайлавіч. — Напрыклад, гасцей з ПАР амаль што не вылоўлівалі на вуліцах, каб сабраць усіх... Пераможца конкурсу маладых выканаўцаў з Літвы быў нечакана здзіўлены таму, што да яго, калі стала вядома, што ён — уладальнік Гран-пры, падыходзілі на вуліцах і прасілі аўтографы. Напэўна, аб такой папулярнасці ў сябе на Радзіме ён і не марыў!».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# НАВАСЕЛЛЕ ГОРАДА МАЙСТРОЎ

Майстры народных рамёстваў сёлета на «базары» змянілі месца сваёй дыслакацыі. Горад майстроў справіў наваселле на беразе Заходняй Дзвіны ў цэнтры народных рамёстваў і мастацтваў «Задзвінне». Калісьці тут размяшчаліся «саляныя склады». Цяпер у гэтым помніку архітэктуры XVIII стагоддзя створаны непаўторны куточак нашай спадчыны. Дзейнічае рэстаран беларускай кухні, зала абрадаў.

— Я з Новалукомля, — расказвае ганчар Валерый Скобаў. — На «базар» прыязджаю чацвёрты год запар. Тут больш прасторна ў параўнанні з цэнтрам горада, дзе мы знаходзіліся раней, а ахвотнікаў паглядзець на нашу работу, нешта купіць — не менш...

Цікава, дарэчы, было назіраць, як выстройвалася чарга з ахвотнікаў навучыцца ў Валерыя Скобава ганчарнаму рамяству. «Майстар-клас» падчас нашай гутаркі прайшлі некалькі чалавек. Безумоўна, гэта здарава — зрабіць нешта з гліны ўласнымі рукамі! Пасля абпалу ў печы можна ўзяць сваю работу на памяць.

Між іншым, у Горад майстроў прыходзіў Валерый Аляксеевіч штодзень як на працу — тут ён ужо з васьмі гадзін раніцы. І да дзевяці вечара. Цяпер ён на пенсіі, а раней працаваў у творчай майстэрні пры заводзе. Быў адным з першых, хто «паставіў гліну на паток». Было гэта ў 1970-ыя.

— А як вам у Горадзе майстроў на новым месцы? — пытаю майстра з пасёлка Обаль Аляксандра Любімага.

— Ды добра. Няма такога натоўпу з прахожых, як раней побач з ратушай.

— А ці купляліі ў вас работы знакамітасці — «зоркі» мастацтваў?

— Купіў прадстаўнік калектыву Бабкінай на яе заказ маю кераміку. Вядома ж, прыемна.

Некалькі сотняў умельцаў працавалі у гэтыя дні на «базары». Праводзіліся конкурсы вышывальшчыц і каруначніц.

Мастакі малявалі партрэты ля фантана на вуліцы Леніна і ў раёне канцэртнай залы «Віцебск» прадаюць свае работы.

Што датычыцца перспектыў «Задзвіння», то ўжо спраектаваны спуск па лесвіцы да ракі, дзе можна будзе адправіцца ў воднае падарожжа. Побач з «Салянымі складамі» плануюць у старым доме размясціць кузню. Ёсць ідэя на пустым месцы, што побач, пабудаваць горад сярэдніх вякоў. Дарэчы, клуб гістарычнай рэканструкцыі ўжо дзейнічае пры «Задзвінні», а ўсяго — каля 20 самых розных клубных аб'яднанняў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**



# ПАД ШКЛОВАМ РАСКАПАЛІ СТАРАЖЫТНЫ ДОМ І ПАДМУРАК ЗАМКАВАЙ ВЕЖЫ

**Гісторыкі і студэнты-археолагі дэманструюць цікавыя знаходкі, зробленыя ў Старым Шклове і на месцы Шклоўскага замка**

На беразе Дняпра, на ўскраіне вёскі Рыжкавічы ў сярэднявеччы стаяў Шклоўскі замак. У XVI стагоддзі яго пабудавалі графы Хадкевічы. Замак не выглядаў як еўрапейскі палац з садам, а быў магутным абарончым збудаваннем на памежжы.

На месцы Шклоўскага замка беларускія археолагі праводзяць раскопкі з 2002 года. Тут працуюць супрацоўнікі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, выкладчыкі і студэнты Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У кожным сезоне знаходзяць нешта новае. У мінулыя гады раскапалі гаспадскі дом, дзе ў падмурку былі знойдзены срэбраныя манеты 1653 і 1657 гады. Цяпер іх і іншыя знаходкі можна пабачыць у экспазіцыі Шклоўскага краязнаўчага музея.

А днямі археолагам зноў пашанцавала: знойдзены падмурак абарончай вежы. У ім добра бачныя слаі, звязаныя з рознымі гістарычнымі перыядамі. Апошняму слою папярэднічае чорная паласа: гэта след пажару, калі ў другой палове XVII стагоддзя шклоўскія землі і замак заваявала войска рускага цара Аляксея Міхайлавіча. Потым рускія аднавілі і прывялі ў парадак імі ж разбураныя замкавыя ўмацаванні.

Падчас раскопак апошніх археолагі знайшлі вітражнае шкло, чарапіцу, кафлю, замок і ключ — відаць, ад дзвярэй вежы. Дзяўчат асабліва зацікавіў кавалак рынкі — глінянай патэльні, у якой гаспадыні сярэднявечча гатавалі ежу.

— Мы марым, што ў будучыні на месцы сярэднявечнага Шклоўскага замка адкрыецца музей пад адкрытым небам, — сказала загадчыца цэнтра Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук Вольга Ляўко.

Шклоў — гэта ўнікальны горад, які тройчы мяняў свой гістарычны цэнтр. Задоўга да таго, як узвялі Шклоўскі замак, горад пачаўся з іншага месца. Самы Стары Шклоў месціцца кіламетраў за пяць ад сучаснага райцэнтра.

— Гэта ўнікальны помнік археалогіі, — сустракае кіраўнік каманды археолагаў, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржуніверсітэта, доктар гістарычных навук Ігар Марзалюк. — Тут у X стагоддзі ўзнік Шклоў як цэнтр племя крывічоў. Гэта была тэрыторыя Полацкай дзяржавы.

Сярод зялёных пагоркаў, парослых чаборам і суніцамі, маладыя людзі раскопваюць старажытнае жытло. Падмурак, печка-каменка, умацаваны тын. На вязкай цыраце археолагі выкладаюць свае знаходкі.

Ігар Марзалюк паказвае кавалак глінянага посуду, на донцы — кляймо сонейка: «Сімвал сонца — гэта добры знак, увасабленне жыцця і ачышчальнага агню. Каб чалавек доўга жыў, каб добра елася і ўсяго хацелася. Гэта прыкладна X стагоддзе, а пасля прыняцця хрысціянства майстры на донцах сваіх вырабаў сталі ставіць крыжы».

На іншым кавалку гаршковай кафлі, якая датуецца канцом XV—пачаткам XVI стагоддзя, ёсць пячатка герба Полацкай зямлі: леў, які падняўся на лапах.

Гэтыя і іншыя знаходкі пацвярджаюць звесткі, вядомыя гісторыкам з іншых крыніцаў. Раскопкі пад Шкловам працягваюцца, і археолагі ўпэўненыя, што яны прынясуць яшчэ нямала сюрпрызаў.

**Ілона ІВАНОВА.**
*Шклоўскі раён*





НА ЗДЫМКАХ:
● ***На кавалку гаршковай кафлі — пячатка Полацкай дзяржавы: стылізаваная выява льва, які падняўся на лапах.***

● ***Студэнтка факультэта гісторыі і археалогіі Магілёўскага дзяржуніверсітэта Наталля Кочнева зацікавілася кавалкам рынкі — глінянай патэльні, на якой у сярэднявеччы жанчыны гатавалі ежу.***

Прэм'ера

# Хвароба кахання

**Як ні дзіўна, напрыканцы тэатральнага сезона многія тэатры знаходзяць у сабе сілы прадставіць публіцы прэм'еру. Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі на развітанне падрыхтаваў пастаноўку паводле новай п'есы Дзіяны Балыка «Раман + Юлія».**

Пра што хочацца развважаць маладому аўтару летам? Вядома, пра каханне. Пра тое, чаму яно часам бывае трагічным. І калі для сваёй першай п'есы «Белы анёл з чорнымі крыламі», якая была ўвасобленая на беларускай сцэне, Дзіяна Балыка абрала вострую для моладзі праблему распаўсюджання СНІДу, то цяпер яе героі не столькі думаюць пра наступствы кахання, колькі пра тое, як яго абараніць. Хоць іх пачуццё таксама абцяжаранае хваробай.

Гераіня Юлія — студэнтка, але яна хворая на цукровы дыябет. Раман — сучасны хлопец, дыджэй і музыкант. На думку бацькоў, у сына вельмі добрыя перспектывы ў жыцці. Вось толькі навошта яму звязваць свой лёс з хворай дзяўчынай? Бацькі Юлі таксама непакояцца: у дачкі і так хапае праблем, а тут яшчэ гэтае каханне, дзіця, якое павінна нарадзіцца... У кожнага пакалення свае погляды на будучыню гэтай пары. Дарослыя не вераць у «юнацкую закаханасць». Але моладзь вырашае, што мае права на шчасце ў любых умовах. Вось толькі ці здолее яна яго захаваць?..

Спектакль аздоблены сучаснай харэаграфіяй Вольгі Скварцовай і Дзмітрыя Залескага, музыку стварыў Андрэй Лабчэўскі, песні выконваюць акцёры тэатра — усё дзеля таго, каб моладзь падумала пра тое, што каханне — гэта адказнасць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

*Организация сдает в аренду*
**СКЛАДСКОЕ ПОМЕЩЕНИЕ**
*в г. Молодечно (центр), 2-этажное, 1400 кв. м., h-4, 2 лифта, кран-балка, хороший ремонт, по цене 3 евро кв. м.*
**Возможна продажа.**
**Тел.: 8 029 3 04 06 40, 8 029 775 58 14, 8 01773 7 79 13.**
УНН 600414766

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.07 | 21.24 | 16.17 |
| Віцебск — | 4.50 | 21.20 | 16.30 |
| Магілёў — | 4.57 | 21.14 | 16.17 |
| Гомель — | 5.02 | 21.03 | 16.01 |
| Гродна — | 5.24 | 21.38 | 16.14 |
| Брэст — | 5.32 | 21.31 | 15.59 |

**Месяц**
*Поўня*
***Месяц у сузор'і Рыбаў.***

**Імяніны**
***Пр.*** *Аляксандра, Кірылы, Панкрата, Фёдара.*
***К.*** *Марыі, Магдалены, Лаўрэнція.*




## Дзве даты

## 22 ліпеня

**1573 год** — нарадзіўся Даніла Набароўскі, паэт, перакладчык, урач. Вывучаў замежныя мовы, медыцыну ў Базелі, сачыненні антычных аўтараў у Арлеане і Страсбургу, слухаў лекцыі Галілея ў Падуі, захапіўшыся яго вучэннем. Працяглы час жыў у Нясвіжы. Актыўна змагаўся з эпідэміямі ў Беларусі, якія забіралі тысячы жыццяў, напісаў некалькі медыцынскіх трактатаў. Адначасова займаўся літаратурнай творчасцю. У вершах і вершатворных пасланнях паказаў карціны, якія адлюстроўвалі жыццё беларускага народа.



**1898 год** — у сяле Шушанскае адбылося вяселле Ўладзіміра Ўльянава і Надзеі Крупскай.

## Цытата дня:

***«Давайце жыць так, каб нават трунар пашкадаваў аб нас, калі мы памром».***
**Марк Твен (1835—1910), амерыканскі пісьменнік.**

## Усміхнёмся!

**Дзве сяброўкі.**
**— Кацька, вось ты працавала ў мужчынскім калектыве? Не? Тады ты НІЧОГА не ведаеш пра брудныя кубкі!**

☺

Гарэлка — 300 гадоў на рынку жаночай прыгажосці.

☺

**Для вярблюда пакрыўдзіць чалавека — раз плюнуць!**

☺

Новы выкладчык ва ўніверсітэце знаёміцца з групай:
— Так, падарункі для мяне ёсць?
Усе:
— Не!
Адзін:
— Ёсць!
Выкладчык:
— Гэта я трохі інакш сфармуляваў пытанне, якое гучыць так: «Выдатнікі ў групе ёсць?». Бачу, адзін ёсць.




# РЫНАК СВОЙ — ТАВАР ЧУЖЫ

**Каб прааналізаваць, які тавар прапаноўваецца нашаму спажыўцу, давялося наведаць кааператыўны рынак, які ў Баранавічах самы буйны. У выхадныя людская плынь накіроўваецца менавіта сюды.**

Яшчэ на падыходзе да цэнтральнай брамы пачаў зазіраць у павільёны, але не ва ўсе — прапускаў парфумерыю, чай, каву ды іншую замежную драбязу. Зайшоў у павільён сантэхнікі і ўбачыў, што нічога беларускага там няма. Ракавіны, ванны, розныя змешвальнікі і нават шрубы і самарэзы — замежнай вытворчасці, галоўным чынам расійскай.

Пад шыльдай «Бытавыя тавары» прапаноўваліся зварачныя апараты, электрагэблікі, дрылі, пілы і яшчэ шмат чаго патрэбнага, але, зноў жа, айчыннага інструменту не было.

Наступны павільён спецыялізуецца толькі на газавых калонках. Але і тут лідарства захапілі расійскія вытворцы. Пецярбургская «Нява» прадстаўлена пяццю відамі. Ёсць украінская калонка і нават партугальская. Але гэтыя дзве апошнія, як і наша (выпускаецца ў Брэсце) не дужа папулярныя. Украінскую і партугальскую не ставяць на абслугоўванне газавікі, а брэсцкую тыя ж газавікі, як і прадаўцы, не рэкамендуюць, бо ў калонцы начынка кітайская.

Да апісанага вышэй тавару мы ўжо вяртацца не будзем з той прычыны, што і ў межах рынку сітуацыя з ім такая ж.

Самую вялікую плошчу рынку займаюць палаткі, у якіх гандлююць таварамі лёгкай прамысловасці. Можна сказаць, што гэтая ніша для беларускай прадукцыі закрытая і паціснуць канкурэнтаў будзе надзвычай цяжка. Адкуль сюды завозяць тавар, устанавіць проста — гэта Украіна і Расія, хоць цэтлікі на кашулях ці басаножках могуць быць самыя экзатычныя ці нават прэстыжных фірмаў. Праўда, ёсць прадукцыя, на якой указана, дзе яна выпушчана. Напрыклад, шкарпэткі «Жытомірскі стыль» прадаюцца па паўтары тысячы, а гэта танней чым брэсцкія ці віцебскія. Па якасці беларускія лепшыя, але ж пакупнік найперш глядзіць на кошт.

Скураныя курткі можна набыць без праблем. Іх прадаюць у крамах, якія выцягнуліся ў некалькі радоў. Кітайскія, турэцкія ці італьянскія (хоць у гэта паверыць цяжка) прадаюцца ад 100 долараў і не лепшай якасці, як і абутак. Адназначна: з нашымі «Марко» ці «Белвест» яго параўнаць немагчыма, але знешне абутак выглядае добра і яго купляюць. Цана і тут адыгрывае сваю ролю.

Сярод тавараў для дома нам таксама няма чым асабліва пахваліцца. Беларускія шпалеры прадаюцца, але ж расійскія і тут наступаюць, гэта датычыцца і розных фарбаў. Побач з нашай прадаецца фарба польскай, украінскай і расійскай вытворчасці. І здзіўляе тое, што наша фарба не таннейшая за замежную, а з гэтай прычыны не можа канкурыраваць.

Ды куды ні паглядзіш — паўсюль імпартнае. Шарэнгамі стаяць дзіцячыя каляскі, рулоны тканіны на прылаўках, нават вуды і розныя рыбацкія снасці не нашы, а пра гумовыя лодкі ўвогуле маўчаць трэба.

Калі з прамысловымі таварамі карціна ясная, то з прадуктамі некалькі іншая.

З садавіной сітуацыя абсалютна пройгрышная. І справа не ў лімонах і апельсінах, няхай іх прадаюць на здароў'е спажыўцам, але калі яблыкі сёння каштуюць 5—7 тысяч рублёў, то ёсць над чым задумацца. Калі не маем сваіх пладасховішчаў, то будзем купляць галандскія і польскія.





Што датычыцца гародніны, то тут нашым вытворцам дыхаецца лягчэй — няма вялікай канкурэнцыі. Капуста, морква, агуркі свае, а вось з памідорамі больш складана. Таматы з Малдовы і Іспаніі значна смачнейшыя і крыху таннейшыя за нашы — цяплічныя.

А назіраючы, як ідзе гандаль бульбай, то разумееш, што яна сапраўды наш найважнейшы тавар.

У рыбных павільёнах пакупнікоў малавата. Тут тавар расійскі, ды і далікатэсы дарагаватыя, а каля аўтамашыны з жывой рыбай натоўп. Рыбгас «Сялец» прадаваў карпаў — 4950 руб/кг. Шкада, што адна цыстэрна на ўвесь рынак.

Каля прылаўкаў з мяснымі і малочнымі прадуктамі не працiснуцца і канкурэнцыя стаіць паміж сваімі вытворцамі. Некалькі гадоў таму наступала польская свініна, а цяпер, пасля ўстанаўлення з Польшчай еўрапейскай мяжы, сітуацыя з мясам стабілізавалася.

Жывёлагадоўлі ў нас надаецца асаблівая ўвага і не дзіўна, што мяса-малочнымі прадуктамі беларускі рынак насычаны, ды і значная частка адпраўляецца на экспарт, а вось перапрацоўку садавіны запусцілі.

Мінулі часы, калі можна было ўтрымацца на рынку дзякуючы нейкім маніпуляцыям. Вось купляю корм для сабак. Мясакамбінат у Баранавічах выпускаў кансервы «Дружок», «Геркулес», «Палкан»... — назвы розныя, а змесціва адно — крупы з пахам мяса. Мясакамбінат мудрыў-хітрыў... і знік.

* * *

Вяртаючыся з рынку, зайшоў у магазін швейнай фабрыкі «Бараўчанка» і ўбачыў развешаныя касцюмы ад шэрага да чорнага колераў. Было ўражанне, што вярнуўся гадоў на дваццаць назад.

А ў спецыялізаваным магазіне «Віцязь» паліцы застаўлены тэлевізарамі і прадаюць іх з растэрміноўкай на год.

Спажыўцам добра, а вытворцаў жыццё прымушае. Рынак не дрэмле — за пакупніка неабходна змагацца.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# ЧАКАЕМ НАСТУПНУЮ ЗМЕНУ,





# або Дзіцячы адпачынак у самым разгары!

***У дзіцячым аздараўленчым лагеры «Асілак», што пад Барысавам, заканчваецца чарговая змена. Хутка яшчэ дзвесце хлопчыкаў і дзяўчынак прыедуць у гэты жывапісны куточак, каб не толькі адпачыць, але і набрацца здароўя — тут працуе медыцынскі цэнтр, дзе дзеткі прымаюць ванны, п'юць гаючую гарбату, плаваюць. «Асілак» — лагер спартыўнай накіраванасці. Менавіта таму тут праходзяць малыя Алімпійскія гульні — дзень піянербола, міні-футбола, тэніса, бадмінтона і іншых відаў спорту.***

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**
*Барысаўскі раён.*

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 3906. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12